ШТО ДАПАМАГАЕ ВЫЖЫЦЬ? І ПЕРАЖЫЦЬ 9

ТАЯМНІЦЫ КРЭЎСКАГА ЗАМКА 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЖНІЎНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 146 (29515)

ЦЫТАТА ДНЯ

Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«Мы бачым, што ў цэлым па краіне штогод ўводзіцца каля 130 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля. На мой погляд, гэта крытычна малы вынік, неабходна ў разы павялічваць аб'ёмы такога будаўніцтва. Урадам створана рабочая група, якая да канца лета павінна ўнесці прапановы па развіцці будаўніцтва арэнднага жылля ў краіне ў цэлым. Мы маем намер крыху падкарэктаваць канцэпцыю. Больш уважліва разглядаем практыку, якой карыстаюцца ў краінах-суседзях. Напрыклад, у дачыненні да такога паняцця, як даходны дом, арэндны дом, для таго, каб гэта стала цікава і камерцыйным забудоўшчыкам, а не толькі для таго, каб будаваць дзяржаўнае арэнднае жыллё».

На вышыні!

Доўгачаканыя алімпійскія медалі Беларусі прынеслі спартсмены, якія ў сваіх відах спорту звязаныя менавіта з імкненнем уверх. Іван ЛІТВІНОВІЧ у суботу ўзяў «золата» ў скачках на батуце, а Максім НЕДАСЕКАЎ — у нядзелю «бронзу» ў скачках у вышыню. Хлопцаў павіншаваў Прэзідэнт, а радаваліся за іх поспех усе нераўнадушныя беларусы, якія хочуць, каб іх краіна заўжды была на вышыні.

Фота БелТА.

КАРОТКА

- **Беларускі саюз жанчын аб'явіў рэспубліканскі конкурс на найлепшае асвятленне ў СМІ яго дзейнасці.**
- Дачнікі Сенненскага раёна разам з эколагамі і работнікамі лесу правялі добраўпарадкаванне пасёлка.
- **Захваральнасць на вірусныя гепатыты ў Беларусі за паўгода знізілася на 16,1 %.**
- У Навагрудскім раёне з-за дзіцячага свавольства з агнём згарэла 60-тонная сцірта сена.
- **Больш за 500 рабочых месцаў прапануюць наймальнікі Мінска на кірмашы вакансій 5 жніўня.**
- У Магілёўскай вобласці праваахоўнікі знішчылі больш за тры тоны наркатычных раслін.

Чырвоная зона

НА АДНЫМ ДЫХАННІ,

альбо Што адбываецца ў пульманалагічным аддзяленні, дзе лечаць хворых на COVID-19

Пятая клінічная бальніца застаецца адной з медустаноў Мінска, куды шпіталізуюць хворых на COVID-19. Цяпер тут працуе пяць пульманалагічных аддзяленняў (большасць з іх была перапрафілявана з пачаткам пандэміі) і адно рэанімацыйнае, якія лечаць пацыентаў з каранавірусная інфекцыяй. Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў адной з «пульманалогій», дзе ўсведамляеш, што лета і гарачыня — не нагода адмаўляцца ад масак, грэбаваць сацыяльнай дыстанцыяй і адкладваць вакцынацыю. СТАР. 8

Малая радзіма

ГЕНІЙ МАЙГО МЕСЦА

Як цікавасць да гісторыі ўласнага роду дапамагла прадпрымальніку стварыць новую турыстычную тэхналогію

Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей.

Юрый ВАЖНІК узначальвае Беларускую асацыяцыю экспертаў і сюрвееraў на транспарце, жыве ў Мінску. Але ў вольную часіну стараецца наведаць мясціны, дзе нарадзіўся, правёў дзяцінства і школьныя гады, бацькоўскі дом. Юрый Пятровіч — сапраўды апантаны чалавек, які імкнецца зрабіць сваю малую радзіму, Пухавіцкі раён, прыцягальным для турыстаў. СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НАША ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — ЗАХАВАЦЬ ЛЮДЗЕЙ»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра па надзвычайных сітуацыях Вадзіма Сіняўскага

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што новы міністр МНС быў прызначаны зусім нядаўна — 11 сакавіка 2021 года. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якая сітуацыя ў міністэрстве, якія недахопы лічыць неабходным ліквідаваць міністр для ўдасканалення работы ведамства.

Прэзідэнт гаварыў і аб самай балючай сезоннай праблеме: «Мяне здзіўляе адзін факт — мы так перажываем за ковід, нас крытыкавалі і там, і тут. Але ў нас на вадзе патапілася больш за 350 чалавек з пачатку года. Больш за 80 % з іх — у нецвярозым стане. Можна было сказаць, самі вінаватыя. Але ёсць жа доля адказнасці і наша».

Кіраўнік дзяржавы таксама пацікавіўся, якая ў краіне абстаноўка з ляснымі пажарамі. «Колькі людзей загінула, колькі выратавана? Гэта наша галоўная задача — захаваць людзей. І не нанесці шкоду эканоміцы, каб гэты ўрон быў самы мінімальны. Як у нас з пажарнай небяспекай? Я інфармаваны пра тое, што ў нас на поўдні тарфянікі гарэлі або гараць. Якая сітуацыя ў лясах і на тарфянніках?» — запытаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама Прэзідэнт і міністр абмеркавалі шэраг надзённых пытанняў, што існуюць у МНС.

Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім Сіняўскі далажыў Прэзідэнту, што за час свайго знаходжання на пасадзе паспеў аператыўна аб'ехаць усе абласныя ўпраўленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, асобныя органы і падраздзяленні, у тым ліку атрады і падраздзяленні, якія дыслацыруюцца на буйных прамысловых прадпрыемствах.

«Штосутачна адпрацоўваем больш за чатыры тысячы зваротаў, усе грамадзяне атрымліваюць кваліфікаваную дапамогу. Сёлета падраздзяленнямі МНС выратавана больш за тры тысячы людзей, у тым ліку 96 дзяцей», — расказаў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

Каментарый у тэму

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Вадзім Сіняўскі расказаў, пра што канкрэтна ішла размова з кіраўніком дзяржавы.

Паводле слоў міністра, за першае паўгоддзе 2021 года на тэлефонныя лініі 101 і 112 у МНС паступіла 630 тысяч паведамленняў аб дапамозе. З іх амаль 60 тысяч — аб пажарах і надзвычайных сітуацыях. Звыш 99 тысяч — аб парушэннях умоў жыццядзейнасці насельніцтва. Каля 472 тысяч — па розных пытаннях аказання кансультацыйна-даведачнай дапамогі і псіхалагічнай падтрымкі. Усяго падраздзяленні МНС па сігнале «Трывога» выязджалі 33,7 тысячы разоў. У тых або іншых надзвычайных сітуацыях выратавана больш за тры тысячы грамадзян.

«Асноўная прычына — асабістая бесклапотнасць»

Асобна Вадзім Сіняўскі засяродзіўся на праблеме гібелі людзей на вадзе гэтым летам. «Асноўная прычына гібелі на вадзе — асабістая бесклапотнасць, злоўжыванне алкаголем падчас купання і купанне ў неўстаноўленых месцах», — падкрэсліў міністр па надзвычайных сітуацыях. Вадзім Сіняўскі расказаў, што і МНС, і Таварыства ратавання на водах, органы ўнутраных спраў і дзяржаўнай улады праводзяць шырокую інфармацыйную палітыку, каб звярнуць увагу грамадзян на праблему ў дадзенай сферы. Аднак не ўсе прыслухоўваюцца да рэкамендацый.

«Мы вельмі актыўна выконваем функцыі па захаванні бяспекі за кошт нашых баявых разлікаў: людзі нясуць службу па забеспячэнні бяспекі на пажарах, мы здымаем іх з нарадаў для таго, каб рэагаваць на сітуацыі на вадзе. Дадатковыя сілы і сродкі накіраваны дзеля выратавання людзей», — расказаў кіраўнік ведамства.

Вадзім Сіняўскі расказаў журналістам пра сітуацыю з пажарнай небяспекай. «Рост пажараў — на 6 %, гібель людзей — на жаль, на 9 %. Загінулі 374 чалавекі на пажарах», — адзначыў міністр. Асноўная прычына гібелі людзей — неасцярожнасць пры курэнні, невыкананне правілаў эксплуатацыі электрапрыбораў. Дзякуючы касмічнаму маніторынгу ўзгаранні ў экасістэмах знізіліся больш чым у 2,5 раза. Непатушаным застаецца адзін пажар — на тарфянішчы ў Петрыкаўскім раёне. Плошча ўзгарання першапачаткова была каля 100 га, цяпер агач складае 40 га. «Ён лакалізаваны, але праблема ў тым, што ён гарыць у глыбіню», — растлумачыў Вадзім Сіняўскі.

Двухбаковае супрацоўніцтва

Наталля КАЧАНАВА:

«Мы заўсёды падстаўлялі плячо адзін аднаму»

Спікер Савета Рэспублікі сустрэлася з Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Азербайджана ў Рэспубліцы Беларусь Лаціфам Гандзілавым. Нагода для сустрэчы — заканчэнне яго дыпламатычнай місіі ў нашай краіне. У пачатку размовы Старшыня Савета Рэспублікі падзякавала паслу за цёплыя адносіны і тое, што ім было зроблена за час дзейнасці ў Беларусі.

Наталля Качанава прыгадала сустрэчы на высокім узроўні: у прыватнасці, візіты прэзідэнтаў (Ільхама Аліева ў Беларусь у 2018-м і Аляксандра Лукашэнкі сёлета ў Баку) Яна перакананая, што добрыя і шчырыя адносіны, якія звязваюць нашы краіны, павінны развівацца і надалей:

— У гэтым няма ніякага сумнення, таму што Азербайджан — гэта стратэгічны партнёр для нашай краіны, мы заўсёды падстаўлялі плячо адзін аднаму і ў простыя, і ў складаныя часы, — адзначыла спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Вядома, у нас зроблена многае ў розных аспектах развіцця ўзаемаадносін: у міжпарламенцкіх, міжурадавых адносінах, па развіцці эканомікі, адкрыты гандлёвы дом Азербайджана і гэтак далей.

Тут Наталля Качанава бачыць заслугу ў тым ліку Лаціфа Гандзілава, якому пажадала поспехаў у далейшай рабоце.

Лаціф Гандзілаў, у сваю чаргу, падзякаваў за магчымасць сустрэцца са Старшынёй Савета Рэспублікі, улічваючы вялікі ўзровень яе занятасці, падкрэсліў вялікую значнасць сёлетняга візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Баку:

— Ён быў вельмі своечасовы і важны, — перакананы дыпламат. — Зверка гадзіннікаў дае магчымасць рухацца наперад.

Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь расказаў, што адразу пасля гэтага візіту адбыліся чатыры зваротныя візіты на ўзроўні Камітэта архітэктуры, міністра сельскай гаспадаркі, старшыні Камітэта па харчовай бяспецы і, нарэшце, міністра абароннай прамысловасці, які ўзяў удзел у выстаўцы ваенна-прамысловых дасягненняў Milex-2021, што прайшла не так даўно ў Мінску.

— Гэтыя чатыры важныя кірункі сёння складаюць неабходныя пытанні, якія трэба рэгуляваць і актывізаваць, — звярнуў увагу дыпламат і нагадаў, што ў верасні запланавана пасяджэнне камісіі па эканамічным супрацоўніцтве. Таму наведванне Беларусі вышэйшымі службовымі асобамі Азербайджана чарговы раз даказвае цікавасць абедзвюх краін адна да адной.

— Перспектывы нашых адносін у мяне не выклікаюць ніякіх сумненняў: яны будуць яшчэ лепшыя, — перакананы дыпламат. — Бо калі ёсць рэальныя справы, яны ўмацоўваюць не толькі эканамічныя адносіны, але і палітычную прыхільнасць адзін да аднаго.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Блізкая ўлада

ЗАДАЦЬ ПЫТАННЕ

Адзіны дзень прыёму грамадзян сенатарамі пройдзе ў Мінску

Новая практыка правядзення прыёмаў членамі Савета Рэспублікі працягваецца. Даказаўшы сваю эфектыўнасць і выніковасць, такая форма работы дае магчымасць людзям звярнуцца да сенатара па месцы свайго жыхарства. Гэтым разам агучыць тое, што хвалюе, змогуць мінчане. Адзіны дзень прыёму грамадзян адбудзецца ў пятніцу, 6 жніўня.

- Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна КАЧАНАВА будзе прымаць грамадзян у адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска (вул. Кальварыйская, 39). Пачатак прыёму ў 10.00. Запісацца на прыём можна па тэлефонах: 321-22-98; 222-66-94; 327-98-21; 352-65-54.

- Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль Міхайлавіч ІСАЧАНКА будзе працаваць са зваротамі грамадзян у адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска (вул. Маякоўскага, 83). Пачатак прыёму ў 11.00. Папярэдні запіс па тэлефонах: 327-62-98; 379-32-87.

- Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Міхайлавіч СІВЕЦ адкажа на пытанні грамадзян у адміністрацыі Заводскага раёна Мінска (вул. Жылуновіча, 17). Папярэдні запіс ажыццяўляецца па тэлефонах: 222-36-34; 389-26-26.

- Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ будзе весці прыём грамадзян у адміністрацыі Савецкага раёна Мінска (вул. Дарашэвіча, 8). Пачатак прыёму ў 11.00. Запісацца можна па тэлефонах: 327-26-71; 271-25-88.

- Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Іванавіч РУСЫ адзіны дзень прыёму правядзе ў адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска (вул. Чкалава, 6). Пачатак прыёму ў 11.00. Запіс па тэлефонах: 327-36-73; 397-07-73.

- Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Анатолевіч РАЧКОЎ у гэты дзень будзе працаваць са зваротамі грамадзян у адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска (пр. Дзяржынскага, 10). Пачатак прыёму ў 10.00. Запіс па тэлефонах: 327-27-18; 390-62-68.

- Член Савета Рэспублікі, абраны ад горада Мінска, галоўны вучоны сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Андрэй Іванавіч ІВАНЕЦ будзе весці прыём грамадзян у адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска (зав. Кузьмы Чорнага, 5). Пачатак прыёму ў 11.00. Запіс па тэлефоне: 357-77-47.

- Член Савета Рэспублікі, абраная ад горада Мінска, намеснік начальніка каардынацыйнага цэнтра «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Марына Аляксандраўна ІЛЬІНА правядзе прыём у адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска (вул. Захарава, 53). Пачатак прыёму ў 11.00. Запіс па тэлефоне: 361-63-61.

- Член Савета Рэспублікі, абраны ад горада Мінска, дырэктар дзяржаўнай установы «Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі» Алег Алегавіч РУМО будзе прымаць грамадзян у адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска (пр. Дзяржынскага, 10). Пачатак прыёму ў 18.00. Запіс па тэлефонах: +375-29-123-83-07, +375-29-702-08-58.

- Член Савета Рэспублікі, абраны ад горада Мінска, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктар Іванавіч ЧАЙЧЫЦ правядзе адзіны дзень прыёму грамадзян у Цэнтральным раёне (вул. Караля, д. 20, к. 1). Пачатак прыёму ў 11.00. Запіс па тэлефоне 8-029-352-85-03.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Еўропу захліснулі пратэсты супраць каранавірусных абмежаванняў

Найбольш маштабныя выступленні адбыліся ў мінулыя выхадныя ў Францыі. У акцыях пратэсту супраць уладаў у рамках барацьбы супраць COVID-19 пашырыць спектр дзеяння «санітарных пашпартоў» узяло ўдзел звыш 200 тысяч чалавек. Аб гэтым паведаміла газета Le Figaro са спасылкай на даныя МУС краіны. У прыватнасці, у Парыжы ў акцыях пратэсту ўзяло ўдзел 14,2 тысячы чалавек, адзначылі ў міністэрстве. Паліцыя ўжыла супраць дэманстрантаў слёзатачывы газ. Кіраўнік МУС Жэральдо Дарманен паведаміў аб затрыманні на працягу суботы 19 дэманстрантаў, у тым ліку 10 чалавек у Парыжы. Ён таксама заявіў аб раненні трох паліцэйскіх у ходзе сутыкненняў з дэманстрантамі. Апроч Парыжа, дэманстрацыі прайшлі і ў іншых буйных французскіх гарадах: Марсэлі, Ліёне, Ніцы, Манпелье. Каля 600 чалавек затрымалі ў Берліне на акцыях супраць COVID-абмежаванняў. На працягу дня ў нямецкай сталіцы прайшло 13 акцый пратэсту. На плошчу, на якой установлена Калона Перамогі непадалёк ад Брадэнбургскіх варотаў, падагналі вадамёты. Як паведаміў таблоід Bild, у Берліне пасля нядзельнай акцыі памёр 49-гадовы мужчына. Таксама людзі выйшлі на пратэсты ў Швейцарыі, Італіі, Грэцыі, Вялікабрытаніі.

Нікол Пашынян прызначаны прэм'ер-міністрам Арменіі

Прэзідэнт Арменіі Армэн Саркісян падпісаў указ аб прызначэнні Нікола Пашыняна на пасаду прэм'ер-міністра краіны. Кандыдатура Пашыняна была вылучана кіруючай парламенцкай фракцыяй «Грамадзянскі дагавор». У адпаведнасці з канстытуцыяй, урад Арменіі будзе сфарміраваны на працягу 15 дзён пасля прызначэння прэм'ера. 17 ліпеня Канстытуцыйны суд Арменіі прызнаў сапраўднымі вынікі датэрміновых выбараў у парламент 20 чэрвеня, на якіх перамогу атрымала партыя в. а. прэм'ер-міністра краіны Пашыняна. Раней ЦВК апублікаваў канчатковыя вынікі датэрміновых выбараў у парламент, згодна з якімі партыя Пашыняна перамагла, набраўшы 53,91 %. Блок экс-прэзідэнта Арменіі Роберта Качарана «Арменія» набраў 21,9 % галасоў, сфарміраваны вакол экс-прэзідэнта Арменіі Сержа Саргсяна і ўзначалены экс-дырэктарам Службы нацбяспекі Артурам Ванецянам блок «Гонар маю» — 5,22 %.

Алімпійскі дзённік

Спаборніцтвы, спрэчкі і выбар — пачаўся новы алімпійскі тыдзень

Алімпійскія гульні ў Токіа прайшлі свой экватар. Ад гэтага напружанне аматараў і саміх спартсменаў толькі ўзрастае, а значыць, барацьба становіцца больш цікавая. На жаль, не толькі спартыўная.

У разгары алімпійскія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, якія ўжо прынеслі Беларусі адзін медаль — «бронзу» Максіма Недасекава ў скачках у вышыню. Бронзавы прызёр Алімпіяды зрабіў свой выбар на карысць роднага горада. Фінансавую падтрымку атрымае Віцебскі абласны комплексны цэнтр алімпійскага рэзерву. Менавіта туды будзе накіравана Br10 тыс. У межах праекта «Алімпійскі выбар» чэмпіён Токіа ў скачках на батуце Іван Літвіновіч выбраў для аказання фінансавай падтрымкі Віцебскую СДЮШАР № 1.

Найлепшы вынік сярод беларускіх стралкоў у фінале паказаў Юрый Шчарбацэвіч. У спаборніцтвах па стральбе з малакалібернай вінтоўкі з 50 м з трох палажэнняў ён заняў 7-е месца. У фінале беларускі стралок доўгі час ішоў у тройцы лідараў, але бліжэй да фінішу дапусціў памылку ў адной з серый і ў рэшце рэшт заняў толькі 7-ы радок у выніковым пратаколе, набраўшы 406,3 бала.

Лёгкая атлетыка. Прыйшла чарга заявіць аб сабе кідальнікам кап'я. У дадзенай дысцыпліне ўся ўвага будзе прыкаваная да Таццяны Халадовіч. На мінулых Алімпійскіх гульнях у Рыа яна заняла 5-е месца. Тую Алімпіяду спартсменка яшчэ доўга называла «балючай тэмай». Але цяпер Таццяна адна з нямногіх спартсменак у свеце, каму пакарыліся 67 метраў. У рэйтынгу Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый яна займае чацвёртае месца. У бегу з бар'ерамі, на старт дыстанцыі 110 метраў з бар'ерамі выйдзе Віталій Парахонька. Выконваючы алімпійскі нарматыў на чэмпіянаце краіны, спартсмен устанавіў і нацыянальны рэкорд — 13,30 секунды.



Фота БелТА.

Веславанне на байдарках і каноэ. У аўторак алімпійскую інтрыгу створаць дзве дзяўчыны — Марына Літвінчук і Вольга Худэнка, якія выступяць у паўфінале байдарак-двоек на дыстанцыі 500 метраў. Жыццё Марыны Літвінчук поўнасцю звязанае са спортам. І не толькі таму, што яна — бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Рыа і Лондане. Марына — жонка алімпійскага чэмпіёна Артура Літвінчука. Шлях ад навічка да прызёра Алімпіяды Вольга Худэнка прайшла ўсяго за шэсць гадоў. Цяпер у яе калекцыі дзве «бронзы» — Лондана і Рыа.

Барацьба грэка-рымская. Адказнасць за гонар краіны ў гэтым відзе ляжа на плечы Кірыла Маскевіча. Аб сваіх вялікіх магчымасцях і амбіцыях ён заявіў у 2020 годзе на этапе Кубка свету ў Сербіі. Тады 22-гадовы спартсмен упэўнена перамог усіх сапернікаў, а ў фінале датэрмінова адолеў алімпійскага чэмпіёна расіяніна Давіта Чакветадзе. Цікава, што гэта першы «дарослы» сезон Кірыла Маскевіча.

Немедальныя спрэчкі. Нацыянальны Алімпійскі камітэт выступіў з афіцыйнай заявай наконт спынення ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях Хрысціны Цімановскай. «Па словах дактароў, у сувязі з эмацыянальна-псіхалагічным станам беларускай лёгкаатлеткі Хрысціны Цімановскай, трэнерскім штабам нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы прынята рашэнне аб спыненні выступлення спартсменкі на Гульнях XXXII Алімпіяды. Такім чынам, адкліканая заяўка спартсменкі на ўдзел у кваліфікацыйных забегах на 200 м і ў эстафеце 4х400 м, — перадае прэс-служба НАК Беларусі, — НАК. Беларусі ўважліва сочыць за сітуацыяй і працуе ў цесным супрацоўніцтве з арганізацыйным камітэтам Гульняў і Міжнародным алімпійскім камітэтам. Падкрэсліваем, у адпаведнасці са Статутам і Алімпійскай хартыяй, НАК Беларусі гатовы і далей адстойваць і абараняць інтарэсы ўсіх беларускіх атлетаў ад любых формаў дыскрымінацыі, калі такія будуць мець месца», — перадалі ў арганізацыі.

Нагадаем, 1 жніўня стала вядома, што Хрысціна Цімановская не возьме ўдзел у кваліфікацыйных забегах на 200 м і ў эстафеце 4х400 м. Дагэтуль спартсменка публічна абвуралася тым, што яе не папярэдзілі аб удзеле ў названай эстафеце.

Галоўны трэнер нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы Юрый Маісевіч у праграме «Тыдзень» на тэлеканале СТБ расказаў пра прычыны такога рашэння. «Мы маем права з ліку спартсменаў, якія тут знаходзяцца, у нас у дэлегацыі, дадаць два іх гэтых чалавек. Яны ж у камандзе! За каманду — гэта ж гонар. Скажам так, у нас дзве бягунні — гэта Герман Эльвіра і Цімановская Хрысціна. Мы просім, размаўляем з трэнерам Герман Эльвіры і кажам: «Вось такая сітуацыя». Ён кажа: «Ды я не супраць, і яна, у прынцыпе, не супраць. Але ёй бегчы бар'ер». Ён просіць — для таго каб не траўміраваць спартсменку, таму што ў яе ёсць асноўны від: давайце мы гэта не будзем агучваць. Мы заяўку падаём, таму што мы не маем права трымаць, у нас дэдлайн быў. А Цімановская кажа, што не змагла датэлефанавацца да нас, але пачакаць гадзіну-дзве, калі мы прыедзем пасля стадыёна... У сілу сваёй выхаванасці, у сілу свайго разумення яна пачынае — гэтак жа цяпер модна ў сацсетках — выплюхваць усякія такія рэчы: з ёй не параіліся! Мы мелі намер усё гэта расказаць, растлумачыць, тым больш яна запасная», — пракаментаваў Юрый Маісевіч.

Гэты інцыдэнт выклікаў вялікі рэзананс сярод спартыўнай грамадскасці. Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 2010 года біятланіст Сяргей Новікаў лічыць, што Хрысціна Цімановская няправільна павяла сябе ў гэтай сітуацыі. На думку спартсмена, у першую чаргу трэба было не посты ў інтэрнэце пісаць, а пагаварыць з трэнерскім саставам.

Параалімпіец Аляксей Талай падкрэсліў, што сваім учынкам Хрысціна Цімановская нанесла шкоду краіне і беларусам. «Вельмі непрыемна мне як спартсмену-параалімпійцу назіраць гэтую сітуацыю. Мы, спартсмены, у першую чаргу — прадстаўнікі краіны. Многія з нас ішлі да гэтага ўсё сваё жыццё, з дзяцінства трэніраваліся, выхоўваліся на патрыятызме, любові да Айчыны. І для нас самая радасная падзея — гэта заваяваць медалі для нашай краіны, каб гучаў гімн тваёй дзяржавы. Не толькі паказаць прыгожы спорт, высокія дасягненні, але і таксама заявіць пра краіну на ўвесь свет. Па нас судзяць аб краіне. І як вяршыня любых спартыўных спаборніцтваў — гэта Алімпійскія і Параалімпійскія гульні, тут у першую чаргу мы павінны сябе паводзіць звышакуратна, тактоўна, выразна, скаардынавана, каб лішняга не выдаваць у эфір. Гэта разумеюць спартсмены з усяго свету. І тут, на жаль, наша Хрысціна паддалася ціску асяроддзя», — адзначыў Аляксей.

Валерыя СЦЯЦКО.

Абітурыент-2021

АПОШНІ ШАНЦ ТРАПІЦЬ НА «БЮДЖЭТ»

Дадатковы набор на вакантныя бюджэтныя месцы абвешчаны ў некаторых ВНУ. Адпаведную інфармацыю трэба шукаць на сайтах вышэйшых навучальных установ.

Напрыклад, у Мазырскім педагагічным універсітэце на спецыяльнасці «Матэматыка. Інфарматыка» засталіся свабодныя сем месцаў. 15 бюджэтных чакаюць абітурыентаў на спецыяльнасці «Біялогія. Хімія» і адно месца — на спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя».

Тыя, хто мае атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асобага ўзору (залаты ці сярэбраны медаль) або дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай, пры наяўнасці рэкамендацыі педагагічнага савета залічваюцца на педспецыяльнасці без сертыфікатаў ЦТ.

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны працягнуты набор на спецыяльнасці «Фізіка» (навукова-педагагічная дзейнасць) — шэсць месцаў і «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова» (англійская) — два месцы.

У Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце чакаюць абітурыентаў на трох спецыяльнасцях: «Вытворчасць тэкстыльных матэрыялаў» (тэхналогія і менеджмент) — 11 месцаў, «Вытворчасць адзення, абутку і скургалантарэйных вырабаў» — восем месцаў і «Метралогія, стандартызацыя і сертыфікацыя» (у лёгкай прамысловасці) — чатыры месцы.

У Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце не запоўніліся бюджэтныя месцы на спецыяльнасці «Геаэкалогія».

Вакантныя бюджэтныя месцы засталіся ў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце — на спецыяльнасцях аграбіялагічнага профілю.

У Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце плануецца дадатковы набор на вакантныя бюджэтныя месцы на спецыяльнасцях «Тэхнічнае забеспячэнне працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці» і «Рамонтна-абслуговая вытворчасць у сельскай гаспадарцы». Працягнуты набор і ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

Таксама да 9 жніўня працягваецца набор на платную форму навучання ў ВНУ. Тым, хто вырашыць вучыцца платна, трэба мець на ўвазе, што кошт навучання ў новым навучальным годзе павысіцца.

Як паведаміў у эфіры праграмы «Контуры» на тэлеканале АНТ **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА,** з 1 верасня плата за навучанне ў вышэйшых навучальных установах падымецца на 10 %. Ён удакладніў, што апошнім разам кошт павялічвалі ў сакавіку 2020 года. За гэты час падняліся базавая стаўка, мінімальная заработная плата, павысіліся тарыфы на камунальныя і іншыя паслугі, таму павышэнне цалкам абгрунтаванае.

Надзея НІКАЛАЕВА.

На слыху

«ПАНІКІ НЯМА, АД ТУРАЎ НІХТО НЕ АДМАЎЛЯЕЦЦА»

Пажар у Турцыі «гарачаму адпачынку» беларусаў не перашкода?

Авіяцыя МНС Беларусі дапамагае ліквідаваць буйны пажар у раёне турэцкага Мармарыса. Борт Мі-8 пазаўчора выканаў восем палётаў, налёт склаў 12 гадзін 29 хвілін. За гэты час было выканана 90 зліваў вады, паведамляе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Другі беларускі Мі-8 знаходзіцца ў іншай частцы Турцыі, экіпаж таксама гатовы да выканання задач і ў выпадку паступлення адпаведнага запыту ад мясцовых уладаў выканае пералёт да гэтага ці іншага ачага. Таксама ён ажыццяўляе дастаўку ратавальнікаў да месцаў пажараў.

Па просьбе турэцкага боку МНС прапрацоўвае пытанне аб накіраванні дадатковага борта — Мі-26Т. Па тэхнічных параметрах выкарыстанне гэтага верталёта ў супрацьпажарным варыянце эквівалентнае прымяненню пяці верталётаў Мі-8.

Між тым, пасольства Беларусі рэкамендуе ўстрымацца ад наведвання раёнаў Турцыі з ляснымі пажарамі. На сваім сайце яно апублікавала рэкамендацыі ў сувязі з апошнімі падзеямі ў шэрагу раёнаў гэтай краіны.

У сувязі са стыхійным бедствам, буйнымі ляснымі пажарамі, якія ўзніклі на курортах Турцыі, Пасольства Беларусі ў Турцыі рэкамендуе суграмадзянам, якія пражываюць і якія прыляцелі на курорты пажаранебяспечных рэгіёнаў, у першую чаргу не паддавацца паніцы, а спакойна знаходзіцца ў сваёй гасцініцы.

Улічваючы, што рашэнне аб эвакуацыі як мясцовых жыхароў, так і пастаяльцаў гатэляў у любым выпадку прымаюць мясцовыя ўлады, рэкамендуецца не пакідаць тэрыторыі гатэляў і пры ўзнікненні пазаштатных або надзвычайных сітуацый строга выконваць указанні мясцовых уладаў і адміністрацыі і быць гатовымі да эвакуацыі.

Для тых, хто плануе накіравацца на адпачынак у рэгіёны, пацярпелыя ад лясных пажараў, рэкамендуецца ўстрымацца ад паездкі: адмовіцца альбо перанесці тэрміны наведвання раёнаў Турцыі з ляснымі пажарамі.

...Мы патэлефанавалі ў адну са сталічных турыстычных фірмаў, якая арганізоўвае туры ў Турцыю, каб пацікавіцца, што цяпер з попытам на іх? Адмаўляюцца беларусы ці не ад паездак на адпачынак у гэтую краіну?

— Адмоў ад тураў няма, попыт на іх не знізіўся, прынамсі, я кажу пра нашу фірму — спакойным добразычлівым голасам распавяла работніца кампаніі. — Вядома, у кліентаў прысутнічае хваляванне, яны задаюць шмат пытанняў, просяць падрабязна распавесці пра сітуацыю. Некаторыя адразу папярэджваюць: пэўныя рэгіёны Турцыі ім не прапаноўваць, але панікі няма.

— А як пачуваюць сябе тыя, хто апынуўся сёння на гарачым адпачынку ў самым прамым сэнсе?

— Нашы спецыялісты звязаліся з усімі кліентамі, з імі ўсё нармальна, як яны самі адказваюць. Хоць, зразумела, тыя фатаграфіі, што дасылаюць адтуль, часам выклікаюць крыху іншыя эмоцыі... Пра эвакуацыю ніхто не згадвае, хоць нашы работнікі папярэдзілі кліентаў, каб на ўсякі выпадак усё самае неабходнае тыя трымалі пад рукой.

— Па вашых словах, адмоў ад тураў няма. А што страчвае кліент у процілеглым выпадку?

— Усё залежыць ад прапісаных умоў у дагаворы. Відавочна, што калі кліент перадумаў, страты непазбежна будуць, і чым бліжэй да даты вылету, тым большыя.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Невядомы БДУ

ВІРТУОЗЫ СЛОВА

Мележ, Броўка, Чыгрынаў... Што агульнага ў класікаў беларускай літаратуры?

У 1980 годзе Алімпійскія гульні (дарэчы, першыя на тэрыторыі Усходняй Еўропы) прайшлі ў Савецкім Саюзе. Спартыўныя спаборніцтвы прымалі Масква, Талін, Кіеў, Ленінград і Мінск. Самы непасрэдны ўдзел у арганізацыі прыёму спартсменаў у беларускай сталіцы браў... філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Фота аўтара.

Сяргей ВАЖНІК: «Дэвіз філфака — «Роднае трэба берагчы!»

Міністэрства адукацыі БССР па просьбе «Інтурыста» прапанавала яго кіраўніцтву падрыхтаваць 85 гідаў-перакладчыкаў са славянскіх моў. Адпаведна, кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства было даручана за паўтара года падрыхтаваць гідаў па польскай, чэшскай, сербахарвацкай і балгарскай мовах. Для заняткаў на курсах адабралі 15 хлопцаў і 70 дзяўчат. Інтэнсіўная падрыхтоўка студэнтаў-перакладчыкаў праходзіла з 2 да 12 чэрвеня 1980 года. Штодзённыя заняткі працягласцю шэсць гадзін уключалі практыку мовы і грамадска-палітычную тэрміналогію, а таксама цыкл лекцый па спартыўным жыцці ў СССР і за яго межамі. У сувязі з Алімпіядай навучальны год быў скарочаны. Заняткі ў другім семестры завяршыліся да 1 мая, а летняя сесія праходзіла з 3 да 29 мая. Гэтымі фактамі з журналістам «Звязды» падзяліўся **дэкан факультэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Сяргей ВАЖНІК.** Напярэдадні стагадовага юбілею ўніверсітэта мы пагутарылі з ім пра ўнікальнасць філалагічнага факультэта і яго ролю ў развіцці гуманітарных навук.

НОВАЯ СТАРОНКА Ў ГІСТОРЫІ

— Афіцыйна, як асобная структурная адзінка, філалагічны факультэт быў аформлены ў 1939 годзе. Фактычна ў той час і адбылося станаўленне класічнага факультэта класічнага ўніверсітэта. Але, зразумела, яго слаўная гісторыя распачалася значна раней, — падкрэслівае Сяргей Важнік. — У 1921 годзе, літаральна з першых дзён функцыянавання БДУ, тут пачынаюць выкладаць мову і літаратуру: спачатку на этнолага-лінгвістычным аддзяленні факультэта грамадскіх навук, а пасля яго рэарганізацыі — на педагагічным факультэце.

У 1951 годзе (пасля чарговай рэарганізацыі) у склад факультэта ўваходзілі чатыры аддзяленні: беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, журналістыкі, логікі і псіхалогіі. У 1967 годзе аддзяленне журналістыкі было рэарганізавана ў самастойны факультэт і на філалагічным факультэце засталіся два аддзяленні: беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры.

Філалагічны факультэт быў самым буйным ва ўніверсітэце. У 1968/1969 навучальным годзе на ім навучаліся 2652 студэнты. І на працягу наступных сарака гадоў гэтая колькасць заставалася амаль нязменная.

Новая старонка ў гісторыі факультэта распачалася ў 1991 годзе. Пасля таго як Беларусь стала незалежнай дзяржавай, змяніліся і задачы, якія стаялі перад вядучым універсітэтам краіны. Патрабавалася вялікая колькасць спецыялістаў па заходнееўрапейскіх і славянскіх мовах. У 1993 годзе ў нас распачалася падрыхтоўка славістаў, у 1994-м — быў праведзены набор на спецыяльнасць «Класічныя мовы і літаратуры», на наступны год — на спецыяльнасці «Беларуская і нямецкая мовы», «Беларуская і французская мовы», «Беларуская і англійская мовы», а з 2001 года стартавала падрыхтоўка кітаістаў.

На сённяшні дзень філалагічны факультэт БДУ ўяўляе з сябе найбуйнейшы цэнтр беларусістыкі, русістыкі і славістыкі ва Усходняй Еўропе. І ў гэтым яго ўнікальнасць, бо з намі могуць параўнацца толькі Маскоўскі і Санкт-Пецярбургскі дзяржаўныя ўніверсітэты. Толькі ў нас вядзецца падрыхтоўка славістаў на спецыяльнасці «Славянскія мовы» адразу па шасці напрамках: паланістыка, украіністыка, балгарыстыка, багемістыка, славакістыка і сербістыка. У нас самая моцная школа беларусістыкі і русістыкі ў Беларусі: на факультэце працуюць 26 дактароў навук.

Таксама філфак БДУ — гэта яшчэ і цэнтр кітайскай філалогіі ў нашай краіне. Мы можам нароўні канкураваць і з Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэтам, і з Рэспубліканскім інстытутам Канфуцыя БДУ, але ў нас ёсць свая адметнасць — мы выкладаем не толькі кітайскую мову, але і літаратуру, невыпадкова спецыяльнасць называецца «Кітайская філалогія». Толькі ў нас мова і літаратура выкладаюцца прыкладна ў аднолькавым аб'ёме, плюс вывучаецца культура Кітая. І толькі ў нас на выхадзе выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю «філолаг, выкладчык замежнай мовы і літаратуры, перакладчык»: так бы мовіць, «два ў адным» — і выкладчык, і перакладчык. Прычым не звычайны перакладчык, а літаратурны. Тое ж датычыцца славянскай, раманагерманскай і класічнай філалогій.

ФУНДАМЕНТ ЧАЛАВЕЧАЙ КУЛЬТУРЫ

— Вы сказалі, што філалагічны факультэт БДУ — гэта класічны факультэт класічнага ўніверсітэта. Які сэнс укладваеце ў гэтыя словы?

— Па-першае, мы маем сёння традыцыйны для філфакаў універсітэтаў усяго свету спектр спецыяльнасцяў: у нас ёсць руская філалогія, беларуская, класічная, раманага-германская і ўсходняя філалогіі. Але я хацеў бы асобна спыніцца на місіі філалагічнага факультэта і прыгадаць словы Дзмітрыя Сяргеевіча Ліхачова, які казаў, што філалогія ляжыць у аснове не толькі навукі, але і ўсёй чалавечай культуры. Граматыка і рыторыка ўваходзілі ў склад сямі свабодных мастацтваў нароўні з арыфметыкай, геаметрыяй, музыкай, астраноміяй і логікай. У Еўропе, у Сярэднявеччы, адукаваным чалавекам мог лічыцца толькі той, хто вывучыў курс сямі свабодных мастацтваў — спачатку ў школах, а затым больш глыбока ва ўніверсітэтах на факультэтах мастацтваў. Такім чынам філалогія складала фундамент універсітэцкай адукацыі. Фундаментальныя гуманітарныя факультэты, такія як філалагічны, гістарычны, філасофскі, шмат у чым прадвызначаюць тое, як чалавек спасцігае свет. Перад чалавекам, які атрымлівае філалагічную адукацыю, адкрыты ўвесь вопыт, назапашаны тысячагоддзямі сусветнай культуры. У нас у руках — слова і мы вучым слову, а без яго не могуць існаваць ні чалавек як асоба, ні народ як нацыя.

Часам даводзіцца чуць пагардлівыя выказванні накшталт таго, што «філалогія — гэта толькі знакі прыпынку і арфаграфія». Між іншым, лінгвістыка — вельмі глыбокая навука, тая ж матэматыка ці нават «сапрамат». Няхай скептыкі паспрабуюць асвоіць і здаць «агульнае мовазнаўства»...

Зноў прыгадаю словы Дзмітрыя Ліхачова: «Літаратура — гэта не толькі мастацтва слова, а мастацтва пераадолення слова, набыццё словам асаблівай лёгкасці... Над усімі сэнсамі асобных слоў у тэксце, над тэкстам яшчэ лунае нейкі звышсэнс, які і ператварае тэкст з простай знакавай сістэмы ў сістэму мастацкую».

У ТВОРЧАЙ АТМАСФЕРЫ

— Сяргей Аляксандравіч, у нашай краіне няма спецыялізаванай установы, дзе б рыхтавалі пісьменнікаў і літаратурных крытыкаў. У Маскве ёсць Літаратурны інстытут, а ў расійскіх творчых ВНУ ёсць спецыяльнасць «Літаратурная творчасць». Чаму б філфаку не ўзяць на сябе такую місію?

— Насамрэч мэтанакіравана мы пісьменнікаў не рыхтуем, але філалагічны факультэт — гэта альма-матар класікаў беларускай літаратуры. Восем народных пісьменнікаў і паэтаў Беларусі з 17 скончылі філфак БДУ або выкладалі на ім: гэта Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Іван Мележ, Іван Навуменка, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Іван Чыгрынаў. Дарэчы, у 2018 годзе на факультэце адкрылася аўдыторыя «Народныя паэты і пісьменнікі Беларусі». Кабінет стаў не проста мемарыяльным комплексам памяці, але і інавацыйнай пляцоўкай для педагагічнай дзейнасці. Навучальны працэс там праходзіць з выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій.

Выпускнікамі філфака з'яўляюцца Алесь Разанаў, Генадзь Бураўкін, Алесь Бадак, Адам Мальдзіс, Людміла Рублеўская, Іван Чарота, Анатоль Бутэвіч і многія іншыя майстры літаратурнага слова. Можа быць, гэта звязана з тым, што тут створаны ўсе ўмовы, каб чалавек раскрываўся ў творчым і літаратурным плане. На філфаку пэўны час дзейнічала літаратурнае аб'яднанне «Узлёт», якое ўзначальваў колішні дэкан Алег Антонавіч Лойка. Менавіта з «Узлёту» і выйшлі ў свет «зоркі» беларускай літаратуры. А сёння на філфаку дзейнічаюць літаратурнае аб'яднанне «Альтанка», Школа маладога аўтара, Клуб аматараў фантастыкі, гурткі «Роднае слова» і перакладчыкаў кітайскай літаратуры на беларускую мову. Паспяхова працуе студэнцкая прэс-служба філалагічнага факультэта, выпускаецца газета «Слова».

Хачу дадаць, што на беларускай філалогіі ў нас ёсць два асноўныя напрамкі: гэта літаратурна-выдавецкая дзейнасць і дзелавая камунікацыя. Дык вось, у рамках літаратурна-выдавецкай дзейнасці вядзецца ў тым ліку і падрыхтоўка будучых літаратараў.

«ПРОФІ» Ў ЛІНГВІСТЫЧНАЙ ЭКСПЕРТЫЗЕ

— А ў якіх увогуле сферах сёння запатрабаваныя выпускнікі філалагічнага факультэта?

— Спектр прымянення талентаў нашых выхаванцаў вельмі шырокі. І гэта не толькі сфера адукацыі. Напрыклад, выпускнікі «літаратурна-выдавецкай дзейнасці» працуюць у літаратурных музеях, архівах, рэдакцыях радыё, тэлебачання, газет, часопісаў, у выдавецтвах, у тым ліку і ў Выдавецкім доме «Звязда». Маладыя людзі, якія маюць навуковыя здольнасці, паступаюць у аспірантуру, потым іх чакаюць у Інстытуце мовы і літаратуры Акадэміі навук ці іншых навуковых установах. Шмат нашых выпускнікоў працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы. Адна з арганізацый, дзе ахвотна прымаюць выпускнікоў філфака, — Дзяржаўны камітэт судовых эспертыз. Апошнім часам вельмі запатрабаваным стаў такі напрамак, як лінгвістычная экспертыза. У нашых планах разам з юрыдычным факультэтам развіваць міждысцыплінарную, міжфакультэцкую вучэбную праграму, звязаную з падрыхтоўкай судовых экспертаў у галіне лінгвістычнай экспертызы.

Выпускнікі «Рамана-германскай філалогіі» могуць працаваць у міжнародных кампаніях у сферы дзелавой камунікацыі.

Дадам, што калі ідуць перагаворы Прэзідэнта Беларусі з лідарамі славянскіх краін, у якасці перакладчыкаў запрашаюць менавіта нашых спецыялістаў. І калі наш славуты барысаўскі футбольны клуб «БАТЭ» гуляў у Лізе чэмпіёнаў і Лізе Еўропы, каб правадзіць на належным узроўні прэс-мерапрыемствы, па дапамогу таксама звярталіся да нас.

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ — НА ЯПОНСКАЙ МОВЕ

— А ці карыстаецца попытам філфак у замежных грамадзян? І наколькі цікавая замежнікам беларуская мова?

— На дзённай форме першай ступені вышэйшай адукацыі на «Рускай філалогіі» і «Рамана-германскай філалогіі» у нас навучаецца больш як 500 студэнтаў з замежных краін: Кітая, Туркменістана, Турцыі, Ірана, Японіі, Паўднёвай Карэі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі і іншых. Да таго ж да 80 чалавек штогод прыязджае на стажыроўку на філфак з Польшчы, Бельгіі, Германіі, Чэхіі, Сербіі, Францыі, Венгрыі і краін Азіі. Увогуле, па колькасці замежных студэнтаў мы ва ўніверсітэце — лідары.

І да беларускай мовы цікавасць з боку замежнікаў таксама ёсць. Прычым не толькі ў студэнтаў, але і ў навукоўцаў. Беларускай мовай цікавяцца нават у Японіі. Усё ж такі гэта краіна — вельмі ад нас далёкая, а японская мова моцна адрозніваецца ад беларускай і сваёй графічнай сістэмай, і фанетычнымі асаблівасцямі. Тым не менш, дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы філфака БДУ Таццяна Рамза і Сіёры Кіёсава з універсітэта горада Цукуба стварылі дапаможнік «Спрабуйма!» — курс беларускай мовы для пачаткоўцаў — носьбітаў японскай. Сіёры Кіёсава праходзіла на нашым філфаку стажыроўку і цяпер выкладае беларускую мову студэнтам у Японіі.

Не так даўно на японскую мову пачала перакладацца паэзія Максіма Багдановіча. Напрыклад, прадстаўнік універсітэта з Токіа Кэн Сібата не так даўно пераклаў на японскую мову «Раманс» беларускага паэта. Яшчэ раней было праведзена даследаванне паэзіі Багдановіча з улікам традыцыйнай японскай паэзіі «Паэзія Максіма Багдановіча ў перакладзе на японскую мову». У навуковым артыкуле параўноўваюцца санеты беларускага і японскага паэта Арыакэ Камбара. Праз гэта параўнанне выяўляецца падабенства і спецыфіка развіцця японскай і беларускай паэзіі XX стагоддзя. Прыведзеныя факты сведчаць на карысць актуальнасці перакладу твораў Максіма Багдановіча на японскую мову.

— На філалагічным факультэце дзейнічае Школа юнага філолага. Што гэта за праект?

— Яго мэта — прафарыентацыя і папулярызацыя філалагічных ведаў сярод школьнікаў. Работа вядзецца па некалькіх напрамках: ёсць школы юнага беларусіста і юнага русіста, Школа юнага літаратуразнаўцы і фальклярыста, Школа літаратурнага блогера, школы юнага кітаязнаўцы, лацініста, італьяніста, германіста... Мы будзем працаваць нават з адным школьнікам, які праявіць цікавасць да таго ці іншага напрамку.

— Вы згадалі Школу літаратурнага блогера. Блогерства — папулярная тэма сярод моладзі. Многія мараць быць імі. Але тут іншы ўхіл...

— Сярод нашых выкладчыкаў ёсць людзі, якія прафесійна займаюцца літаратурным блогерствам, ім ёсць, што расказаць і школьнікам, і студэнтам. Заняткі праводзяць таксама запрошаныя госці-эксперты. Слухачы школы шмат чытаюць, сочаць за літаратурнай модай і кніжнымі навінкамі, вучацца пісаць і распавядаць пра літаратуру, весці кніжны блог, пяруць «крутыя» кнігі, ствараць літаратурныя падзеі.

Мы прааналізавалі: сярод нашых абітурыентаў ёсць і выхаванцы «Школы юнага філолага». Гэта мэтанакіраваныя маладыя людзі, якія робяць свядомы выбар, што не можа нас не радаваць. Увогуле філфак жыве пад дэвізам «Роднае трэба берагчы!» Мы — самы творчы факультэт ва ўніверсітэце. І чакаем да сябе такую ж творчую і неабыякавую моладзь!

Надзея НІКАЛАЕВА.

Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by

Дзеля памяці

Месца мужнасці і болю

Сёння мемарыяльнаму комплексу на Вострае Слёз у Мінску спаўняецца 25 гадоў

Увекавечыць памяць воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія вярталіся з Афганістана ў якасці «груза 200», было вырашана яшчэ тады, калі ішла вайна. Дзякуючы намаганням афганцаў, а таксама маці і ўдовам тых, хто загінуў на чужой зямлі, праз некалькі гадоў на штучным востраве ракі Свіслач каля Траецкага прадмесця з'явіўся помнік. 3 жніўня 1996 года мемарыял адкрыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

З таго часу двойчы на год — у пачатку жніўня і 15 лютага, у гадавіну вываду савецкіх войскаў з Афганістана, на Востраве Слёз, як яго называюць у народзе, надзвычай шматлюдна. Каб ушанаваць памяць воінаў-афганцаў, якія вярнуліся дамоў у цынкавых трунах, у суботу каля помніка сабраліся іх баявыя таварышы, ужо старыя маці і немаладыя ўдовы, дзеці афганцаў, многія з якіх не помняць сваіх бацькаў... Знаходзіліся тут і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, сілавых структур, школьнікі, якія абавязкова павінны ведаць пра тую вайну, а таму добра ўсведамляць, што падобнае больш ніколі не можа паўтарыцца.

— Мы, воіны-інтэрнацыяналісты, маем месца, куды можам прыйсці і ўспомніць свае гады, праведзеныя ў Афганістане, і, вядома, ушанаваць памяць нашых баявых сяброў, якія выканалі свой воінскі абавязак да канца, — адзначыў **старшыня савета Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Валерый ГАЙДУКЕВІЧ.** — Што б ні казалі аб афганскай вайне, мы туды ўвайшлі па загадзе, па ім жа і выйшлі, не страціўшы гонар вайскоўца.

Фота БелТА.

Як пераканаў **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН,** рэха афганскай вайны з кожным годам сыходзіць усё далей, але гэта не значыць, што мы павінны забыцца пра подзвіг нашага народа. «Выконваючы баявыя задачы ў афганскай вайне, нашы людзі паказалі сапраўдны гераізм і здольнасць да самаахвяравання, — падкрэсліў кіраўнік абароннага ведамства. — Героямі Савецкага Саюза сталі сем нашых землякоў, больш чым дзве тысячы вайскоўцаў былі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Іх подзвіг і мужнасць вартыя захаплення.

Якая б ні была вайна, вялікая ці малая, яна заўсёды пакідае глыбокі след у душы народа, з пакалення ў пакаленне перадаецца памяць. І пакуль яна жыве ў нашых сэрцах, у розумах, мы захоўваем сваю нацыянальную годнасць, праяўляем жаданне жыць у міры і стабільнасці».

Па словах **намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара ЛУЦКАГА,** у сённяшні няпросты час патрыятызм, выхаванне маладога пакалення становяцца на першачарговы план. «Воіны-інтэрнацыяналісты павінны быць у авангардзе патрыятычнага выхавання моладзі: яны — яркі прыклад таго, як трэба жыць, будаваць, ствараць і памятаць, — лічыць Ігар Луцкі. — Абарона такіх месцаў — стэлы, Кургана Славы, Вострава Слёз, тысяч іншых помнікаў — гэта наша першачарговая задача. Мы бачым, як спрабуюць зламаць гісторыю. Нават цяпер славу ў Вялікай Айчыннай вайне недаацэньваюць, спрабуюць навязаць іншыя каштоўнасці. І калі мы ўсе разам не станем адзіным строем, мы страцім усё тое, што стваралі».

У вайне, якая цягнулася амаль дзесяць гадоў, удзельнічала больш як 30 тысяч грамадзян Беларусі. 771 воін-інтэрнацыяналіст загінуў у Афганістане. Больш як 700 удзельнікаў баявых дзеянняў, вярнуўшыся на Радзіму, заўчасна пайшлі з жыцця — нагадалі аб сабе незагойныя раны і хваробы. 870 беларусаў сталі інвалідамі, 12 чалавек зніклі без вестак...

Загінуў у Афганістане і муж Тамары Доўнар. Калі яна прыходзіць на Востраў Слёз, заўжды думае, як хутка ляціць час. «Здаецца, яшчэ зусім нядаўна я развітвалася са сваім мужам, калі адпраўляла яго ў Афганістан, а з той пары прайшло ўжо 42 гады, — расказала старшыня Фонду сацыяльнай абароны ўдоў і дзяцейваеннаслужачых, якія загінулі ў Афганістане і іншых лакальных канфліктах, «Доўг». — Здаецца, зусім нядаўна я, як і многія беларускія жанчыны, атрымала «груз 200». Я хачу пакланіцца нашым маці, якія, быццам падбітыя птушкі, падалі на труны, што прывозілі з Афганістана, нашым удовам, якія, застаўшыся зусім маладзенькімі жанчынамі, у большасці сваёй так і не стварылі новую сям'ю, дзецям, многія з якіх не памятаюць сваіх бацькаў, які для іх асацыіруецца з магільным пагоркам».

Вераніка КАНЮТА.

Надвор'е

Першая дэкада жніўня будзе на 1—2 градусы цяплейшая, чым звычайна

У канцы гэтага тыдня сіноптыкі абяцаюць месцамі моцныя дажджы

Чакалі мы дажджу, чакалі — і дачакаліся. З першых дзён жніўня на тэрыторыю нашай краіны выйшаў актыўны паўднёвы цыклон, які прынёс у заходнія рэгіёны інтэнсіўныя ападкі. А ў паўночна-заходніх абласцях — ліўні і навальніцы. На працягу тыдня ў нас чакаецца цёплае і дажджлівае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У сераду ўначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Вецер чакаецца няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8—13 градусаў. Удзень паветра прагрэецца ад 20 градусаў цяпла да 27.

Кароткачасовыя дажджы чакаюцца месцамі і ў чацвер. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы да ўмеранага, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 градусаў да 17. Удзень будзе 20—27 градусаў са знакам плюс.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу праз тэрыторыю Беларусі будзе перамяшчацца чарговая сістэма актыўных атмасферных франтоў. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагназуюцца моцныя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 10 градусаў па поўначы да 18 цяпла па паўднёвым усходзе краіны. Удзень будзе плюс 18—25 градусаў, па паўднёвым усходзе 26—28 цяпла. Калі зазірнуць далей, то нашы спецыялісты прадказваюць у выхадныя ўмерана цёплае няўстойлівае надвор'е. У цэлым першая дэкада жніўня прагназуецца на 1—2 градусы цяплейшай за кліматычную норму. Падобна на тое, горача будзе і ў апошні месяц лета...

Сяргей КУРКАЧ.

Камунальная гаспадарка

Цяпло не вылеціць у трубу

Мадэрнізацыя цеплацэнтраляў у Гродне дазволіць скараціць тэрмін адключэння гарачай вады

Вядома, спажыўцам вельмі важна, каб гарачая вада была пастаянна. Але без прафілактычнага агляду не абысціся. Гродзенскія энергетыкі ўпэўненыя, што перыяд адключэння гарачай вады можна скараціць. Мяркуецца, што гэтаму паспрыяе высокая надзейнасць цепласетак і мадэрнізацыя будынкаў.

Штогод у Гродне пракладваецца каля 20 кіламетраў трубаправодаў. Вось і сёлета мяркуецца рэканструяваць амаль столькі ж. Гэта вялікія аб'ёмы, адзначае **першы намеснік дырэктара філіяла «Гродзенскія цеплавыя сеткі» РУП «Гроднаэнерга» Барыс МІТРЫЧЭНКА.** Палова запланаванага ўжо зроблена.

— Калі такія тэмпы будуць захоўвацца не менш за пяць гадоў, надзейнасць гродзенскіх цепласетак будзе вельмі высокая, — упэўнены суразмоўнік. — Пры гэтым аб'ём дазволіць забяспечыць не толькі высокую надзейнасць у ацяпляльны перыяд, але і значна скараціць тэрміны адключэння гарачай вады. Зусім адмаўляцца ад прафілактыкі немагчыма, бо такія адключэнні патрэбныя і спажыўцам, каб выканаць пэўныя выпрабаванні, праверыць свае цеплавыя лічыльнікі, аўтаматыку, памяняць абсталяванне. Адключэнне неабходнае, але на значна меншы перыяд часу.

Новыя мікрараёны будуюцца толькі з прымяненнем ізаляваных трубаправодаў сучаснымі метадамі і тэхналогіямі. Таму там цяпер толькі прафілактыка, а вось у старой частцы горада вядуцца работы па замене і рэканструкцыі сетак.

На тэрыторыі прадпрыемства ў вочы кідаецца штабель новых труб вялікага дыяметра. Усе яны будуць выкарыстаныя ў падрыхтоўцы да новага ацяпляльнага сезона. З трубамі затрымкі быць не павінна, тлумачыць субяседнік. Большая іх частка паступае ад беларускіх заводаў. І тут не павінна быць стыхійнасці. Трубы выпускаюцца і паступаюць адпаведна з распрацаванымі праектамі і згодна з дагаворамі.

— Да ацяпляльнага сезона мы выканаем рэканструкцыю цепласетак у поўным аб'ёме. У планах — праводзіць работы і ў ацяпляльны перыяд праз часовыя схемы цеплазабеспячэння, як робяць у Мінску. Зімой кладзецца часовы трубаправод, што дазваляе працаваць нават у асенне-зімовы час. Сёння такія работы вядуцца, але з невялікай колькасцю падрадчыкаў. Будзем павялічваць аб'ёмы, — адзначыў у размове Барыс Мітрычэнка.

Гэта становіцца магчыма дзякуючы сучаснай дыягнастычнай лабараторыі. Такая служба была ўтворана амаль дзесяць гадоў таму. Асноўная яе задача — максімальна аператыўны пошук канкрэтнага пашкоджання трубаправодаў, а таксама ацэнка тэхнічнага стану падземных камунікацый.

— Мы шукаем пашкоджанні, а таксама праводзім акустычную дыягностыку, — тлумачыць місію свайго падраздзялення **начальнік лабараторыі Данііл ЦЫБУЛЬНІКАЎ.** — Напрыклад, на гэты год у нас запланавана правядзенне дыягностыкі ўсіх магістральных трубаправодаў, надзейнае цеплазабеспячэнне ў асенне-зімовы перыяд. У нас ёсць цеплавізар для правядзення здымак, а таксама прыбор для відэаагляду, відэаінспекцый падземных камунікацый. Адзін прыбор шукае, дзе знаходзяцца трубы пад зямлёй, другі вызначае канкрэтнае месца, а трэці ўдакладняе яго знаходжанне.

Спецыяліст дэманструе работу дыягнастычнай апаратуры. Нават без выезду на месца няцяжка ўявіць увесь механізм дзеянняў. Ён не такі складаны. На трубаправодах, дзе, магчыма, ёсць праблема, устанаўліваюцца два датчыкі. Іх сігналы прымае вылічальны прыбор, які на аснове гукаў паказвае максімальную даўжыню пашкоджання. Дакладнасць вялікая — да 1 сантыметра. Такім чынам можна бачыць, што адбываецца пад зямлёй. Асноўны пік работ прыпадае на асенне-зімовы перыяд, бо ў гэты час асабліва высокія нагрузкі на цепласеткі.

Фота аўтара.

— Пошук і раскопкі — працэс затратны і доўгачасовы, таму важна максімальна дакладна знайсці месца пашкоджання. Пры раскопках высвятляецца стан трубаправода на дадзеным участку і вырашаецца, што тут рабіць далей — проста лакальны рамонт альбо больш маштабную рэканструкцыю, — паясняе сутнасць работы спецыяліст.

Найбольш часта пашкоджанні здараюцца на старых трубаправодах, там, дзе пракладзены стальныя трубы. Новыя вырабляюцца на заводзе адразу з ізаляцыяй, што змяншае ўздзеянне знешняй карозіі, а таксама памылкі пры мантажы.

Падчас работ здараюцца і нечаканасці. Сёлета пры рэканструкцыі ўчастка дарогі каля заапарка быў знойдзены старажытны водаправод.

На прадпрыемстве канстатуюць, што дзякуючы рэканструкцыі пашкоджанняў з кожным годам становіцца менш. Адпаведна, менш і прафілактычных рамонтаў.

Па словах Барыса Мітрычэнкі, вялікі аб'ём работ праводзіцца на прадпрыемствах ЖКГ і іншых спажыўцоў. Гэта звязана з устаноўкай прыбораў рэгулявання і ўліку. Чым больш становіцца такіх прыбораў, тым больш разумна спажывец адносіцца да паліўных рэсурсаў, пачынае эканоміць. Да таго ж значны ўплыў аказвае работа, якая праводзіцца па цеплавой мадэрнізацыі будынкаў, уцяпленні фасадаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Гродненское областное потребительское общество

(Дятловский филиал)

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Аукцион № 5607

ЛОТ № 31599 – УНИВЕРМАГ С ВОДОПРОВОДНОЙ И ТЕПЛОВОЙ СЕТЯМИ,

Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Дятловская, 1А

• Капитальное строение с принадлежностями, инвентарный номер 451/С-11318, площадью – 1358,5 кв. м, целевое назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – универмаг, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Дятловская, д. 1А.
• Капитальное строение, инвентарный номер 451/С-16096, протяженность линейного сооружения – 34,4 м, целевое назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Дятловская, д. 1А.
• Капитальное строение, инвентарный номер 451/С-16097, протяженность линейного сооружения – 12,7 м, целевое назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Новоельня, ул. Дятловская, д. 1А.
Площадь земельного участка, на котором располагаются капитальные строения – 0,0895 га, кадастровый номер 422383190602000840. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания магазина «Универмаг». Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений): земельные участки, расположенные на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона проживания с периодическим радиационным контролем), код – 3.5, площадь – 0,0895 га.
Здание универмага двухэтажное, расположено в центре г. п. Новоельня. Водопровод центральный, канализация автономная. Отопление осуществлялось от топочной магазина Дятловского филиала Гродненского областного потребительского общества «Пралеска».

Начальная цена продажи – **87 540,68 руб.** (восемьдесят семь тысяч пятьсот сорок белорусских рублей 68 коп.), в т. ч. НДС.

Дата и время начала электронных торгов: 29.07.2021 15.00
Дата и время завершения электронных торгов: 27.08.2021 14.00

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по адресу лота: **https://torgi.gov.by/lot/31599/5607/univermags-vodoprovodnoj-i-teplovoj-setyami-g-p-novoel-nya** необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток

Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, **тел.: 8 (01563) 64581, 68264**

Организатор аукционов – Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики», г. Минск, ул. Берсона, д. 1А, оф. 513, **тел.: 8 (017) 200-73-33, 200-64-11**

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки. Шаг торгов – 5 %.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 календарных дней с момента определения победителя торгов. Условия оплаты – не позднее 30 календарных дней с момента определения победителя торгов

Победитель торгов возмещает стоимость затрат на проведение аукциона согласно прейскуранту (**https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx**) от фактической цены продажи лота, которая списывается с суммы внесенного Победителем аукциона задатка. Оставшаяся сумма задатка засчитывается в счет оплаты предмета аукциона.
Победитель также возмещает Продавцу расходы по публикации объявлений о проведении аукциона в газете «Звязда» и дятловской районной газете «Перамога».
Возмещение затрат по организации и проведению аукциона победитель осуществляет не позднее 5 рабочих дней с момента завершения торгов

Расчетный счет для перечисления задатка: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код банка BELBBY2X, УНП 190318109, ОКПО: 37533622, Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики»

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

УНП 291313486

Отчет за январь–март 2021 года ООО «Санта Ритейл»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 30 июня 2021 года

тыс. руб.

АКТИВЫ	Код строки	На 30.06.2021	На 31.12.2020
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	329 533	313 879
Нематериальные активы	120	3 273	3 465
Вложения в долгосрочные активы	140	15 261	20 526
Долгосрочные финансовые вложения	150	691	928
Долгосрочные финансовые вложения	160	3	2
Отложенные налоговые активы	180	473	388
ИТОГО по разделу I	**190**	**349 234**	**339 188**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	72 345	71 088
в том числе: материалы	211	7 661	6 182
готовая продукция и товары	214	64 684	64 906
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	65	
Расходы будущих периодов	230	9 163	8 914
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	1 009	5 535
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	48 309	48 222
Краткосрочные финансовые вложения	260	0	0
Денежные средства и их эквиваленты	270	5 074	16 785
Прочие краткосрочные активы	280	148	6
ИТОГО по разделу II	**290**	**136 113**	**150 550**
БАЛАНС	**300**	**485 347**	**489 738**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	**Код строки**	**На 30.06.2021**	**На 31.12.2020**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	164 655	159 655
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	30 007	30 294
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	-49 525	-49 741
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-1 164	
ИТОГО по разделу III	**490**	**143 988**	**140 223**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	219 780	215 073
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	105	
Отложенные налоговые обязательства	530	1 730	1 784
Доходы будущих периодов	540		
ИТОГО по разделу IV	**590**	**221 615**	**216 857**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	11 126	11 118
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	69	63
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	108 549	121 477
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	96 137	107 701
по авансам полученным	632	979	876
по налогам и сборам	633	1 292	1 079
по социальному страхованию и обеспечению	634	1 666	1 740
по оплате труда	635	4 737	4 368
по лизинговым платежам	636	3 418	5 399
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637		
прочим кредиторам	638	320	314
Доходы будущих периодов	650		
ИТОГО по разделу V	**690**	**119 744**	**132 658**
БАЛАНС	**700**	**485 347**	**489 738**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–июнь 2021 года

тыс. руб.

Наименование показателей	Код строки	За январь–июнь 2021	За январь–июнь 2020
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	524 188	251 352
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(401 313)	(195 158)
Валовая прибыль (010-020)	030	122 875	56 194
Управленческие расходы	040	(14 349)	(5 199)
Расходы на реализацию	050	(117 034)	(54 930)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	(8 508)	(3 935)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	18 348	11 875
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(4 571)	(2 993)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	5 269	4 947
Доходы по инвестиционной деятельности	100	2 008	3 627
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	1 878	2 469
проценты к получению	103	130	1 153
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(1 829)	(1 654)
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(1 829)	(1 654)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		
Доходы по финансовой деятельности	120	677	8 787
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	677	8 787
Расходы по финансовой деятельности	130	(7 342)	(12 943)
в том числе: проценты к уплате	131	(6 649)	(6 341)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(317)	(6 451)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(376)	(151)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	(6 486)	(2 183)
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	(1 217)	2 764
Налог на прибыль	160		
Изменение отложенных налоговых активов	170	1	
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	54	(123)
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190		
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(2)	(1)
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	(1 164)	2 640
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	(1 164)	2 640

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества
ОАО «Управление механизации № 91» (Продавец)

Лот № 1: трактор ДТ-75, инв. № 60056. **Начальная цена с НДС** – 3 000,00 руб. **Задаток** – 600,00 руб. Шаг аукциона – 10 %.

Лот № 2: бульдозер ДТ-75, инв. № 60082. **Начальная цена с НДС** – 3 000,00 руб. **Задаток** – 600,00 руб. Шаг аукциона – 10 %.

Лот № 3: сваебойная установка СП67, инв. № 60058. **Начальная цена с НДС** – 22 320,00 руб. **Задаток** – 4 464,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Лот № 4: сваебойная установка СП67, инв. № 60060, молот трубчатый СП-76, инв. № 60073. **Начальная цена с НДС** – 22 320,00 руб. **Задаток** – 4 464,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Лот № 5: грузовой самосвал КРАЗ 256, кузов (рама) № 704458. **Начальная цена с НДС** – 6 240,00 руб. **Задаток** – 1 248,00 руб. Шаг аукциона – 7 %.

Лот № 6: грузовой специальный автокран LIEBHERR LTM 1160-5.1, кузов (рама) W09585200EEL05360. **Начальная цена с НДС** – 2 088 000,00 руб. **Задаток** – 208 800,00 руб. **Обременения:** залог. Шаг аукциона – 1 %.

Местонахождение лотов №№ 1–6: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17.

Аукцион состоится 27.08.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **25.08.2021 в 11.00**.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Старобинский» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ АДМИНИСТРАТИВНОГО ЗДАНИЯ

с инв. № 644/С-57945 общей площадью 231,7 кв. м, расположенного на земельном участке (*право постоянного пользования*) с кадастровым номером 625086202501000268 площадью 0,2191 га по адресу: Минская область, Солигорский район, Старобинский с/с, д. Саковичи, ул. Залужная, 2В.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: ограничения прав на земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, пл. 0,2191 га; охранная зона электрических сетей, напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0063 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – 20 376,00 бел. руб. *(Начальная цена снижена на 40 %).* **Задаток 10 % от начальной цены (2 037,00 бел. руб.).**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 05.03.2019, 01.06.2019, 03.04.2020 и 21.11.2020, 17.02.2021.

Аукцион состоится **19.08.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.08.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 324, 320.

Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра: 8 (0174) 29 94 97; 29-67-03; (8 029) 555–75–94.

УНП 600071171

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «Барановичская СПМК-2» (УНП 200167456), объявляет о проведении **13.08.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/07/spisok-imushhestva-baranovichskaya-spmk-2.-torgi-13.08.21.pdf

Местонахождение имущества: г. Барановичи, ул. Вильчковского, д. 184.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Барановичская СПМК-2», тел. +375293923903.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **12.08.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 03.08.21** по **17.00 12.08.21** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор: по лоту № 35 – 6 % от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам – 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

ГЕНІЙ МАЙГО МЕСЦА

ВЯРТАННЕ ДА КАРАНЁЎ

— Мае бацькі — настаўнікі родам з вёскі Бор Пухавіцкага раёна, затым іх перавялі на работу ў вёску Цітва. Там я і нарадзіўся. У пяць гадоў навучыўся чытаць, самастойна вывучыў польскую мову, калі ездзіў электрычкай на вучобу ў Мінск у інстытут, — кажа Юрый Важнік.

У атачэнні зеляніны, яблыневага саду стаіць дом яго бацькоў, якому сто гадоў.

— Маёй цётцы 92, яна помніць, як саджалі гэтыя яблыні, ім дзесьці за 80, але яны пладаносяць да сёння, — кажа субяседнік.

— А як у вас з'явілася цікавасць да краязнаўства? — пытаюся.

— Адноўчы да мяне прыехаў былы аднакурснік, па нацыянальнасці ён азербайджанец. Папарыліся ў лазні, абмеркавалі розныя жыццёвыя тэмы. А ён і цікавіцца, маўляў, ці ведаю, дзе пахаваны мой дзед, які загінуў на фронце падчас Вялікай Айчыннай. Я ведаў, што дзед знайшоў спачын недзе ў Польшчы, але дзе канкрэтна — невядома. Гэта падштурхнула мяне шукаць магілу. Пачаў вывучаць дакументы, працаваць у архівах. І нарэшце знайшоў месца пахавання, з'ездзіў туды. А затым зняў фільм і паказаў кіраўніцтву раёна. З ліпеня ў прысутнасці сваякоў і аднавяскоўцаў з воінскімі ўшанаваннямі імя майго дзеда было занесена на памятны знак у гонар мясцовых жыхароў, загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, — расказаў Юрый Пятровіч.

Гісторыя з дзедам абудзіла ў Важніка цікавасць да сваіх каранёў, продкаў: хто яны, чым займаліся. Ён склаў радавод сваёй сям'і амаль за трыста гадоў, да 11-га калена. Сабраў сваякоў, мабыць, чалавек трыццаць, і раздаў ім выявы генеалагічнага дрэва.

ПЕРСПЕКТЫВЫ СЭНСАВАГА ТУРЫЗМУ

І пайшло-паехала, напісаў кнігу «Тапанімічны Космас», узяў усе назвы населеных пунктаў Пухавіцкага раёна, паспрабаваў растлумачыць іх паходжанне, рэцэнзіраваў яе ў Нацыянальнай акадэміі навук у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа. Затым пачаў пісаць кнігу аб жыцці і творчасці ксяндза Юзафа Бакі «Юзаф Бака. Геній майго месца». Так узнік сайт gmm.by — Нацыянальны праект сэнсавага турызму, інакш — інтэлектуальнага падарожжа.

— Мы знайшлі ў раёне 80 славутых мясцін і выбудавалі маршруты, у межах турыстычнай дзейнасці ўладкоўваем інфраструктуру. Аб'ядналі ўсе рэсурсы пад брэндам «Душа і сэрца краіны», зрабілі білборды і ўказальнікі. Усе ахвотныя могуць падарожнічаць і без экскурсавода, самастойна на машыне, веласіпедзе. Яны могуць зайсці на сайт і атрымаць аўдыягід, турыстычны даведнік, інструкцыі, — пералічвае Юрый Важнік.

Юрый Пятровіч — член савета па развіцці прадпрымальніцтва Пухавіцкага раёна. У яго склаліся добрыя зносіны з мясцовым кіраўніцтвам, якое падтрымлівае яго ідэі. Напрыклад, сумесна плануюць адкрыць байдарачны маршрут па Свіслачы з Мінска ў Пухавічы. Юрый Важнік лічыць, што раён перспектыўны ў плане турызму, да 2025-га зможа прымаць да 200 тысяч турыстаў штогод і прыносіць да двух мільёнаў долараў.

НЕ «КУДЫ», А «ДА КАГО»

Юрый Пятровіч запрасіў мяне ў цікавае падарожжа. Вядома, каб наведаць усе аб'екты, неабходна шмат часу, таму мы выбралі некалькі з іх.

— Канцэпцыя сэнсавага турызму ў тым, што мы едзем не «куды», а «да каго», — уводзіць у курс справы Юрый Важнік. — Для кожнага аб'екта мы прыдумалі вершы і музыку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Першы прыпынак — вёска Блонь. Менавіта тут заснаваў сваю місію — Missio Bakana — ксёндз Юзаф Бака. Тут жа ён пабудаваў і касцёл у 1752 годзе. Гэта быў твор драўлянага дойлідства. Касцёл зачынены ў 1937-м, разбураны пасля вайны. У 1970-я гады на яго месцы пабудавалі школу. Сядзіба Блонь належала ў розныя часы розным уладальнікам — княжацкаму роду Масальскіх, Путкамеру, Асоўскім, Бонч-Асмалоўскім. Будынку больш як 150 гадоў. Ён практычна цалкам захаваўся ў натуральным выглядзе — арыгінальныя сцены, вокны, гарышча, падвал, франтоны. Непаўторную прыгажосць надаюць тасканскія калоны з боку параднага ўвахода. У маёнтку меліся ўсе падсобныя і гаспадарчыя пабудовы: сыраварня, малачарня, млын, крухмальны завод, рэшткі якога захаваліся, парк, сад.

Цяпер тут знаходзіцца Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей, дзе адна з экспазіцый прысвечана жыццю і творчасці Бакі. Нарадзіўся Юзаф 18 сакавіка 1707 года ў заможнай шляхецкай сям'і на сучаснай Лагойшчыне. У 1723-м уступіў у Ордэн езуітаў, вучыўся ў Віленскай акадэміі, стаў ксяндзом, а ў 1740-м даў зарок выканання езуіцкай місіі. Першая місія была ў вёсцы Дукшты Браслаўскага павета, другая — у Краславе і Індруці над Даўгавай. Памёр Юзаф Бака 2 чэрвеня 1780 года ў Варшаве, быў пахаваны ў падзямеллі касцёла езуітаў Маці Божай Ласкавай побач з магілай Мацея Казіміра Сарбеўскага, якога называлі «Сармацкім Гарыцыем». Пасля паўстання 1834 года Бака быў перапахаваны ў зборную магілу пад алеяй Cmentarzu Powazkowskim — на самым ганаровым мемарыяле Польшчы.

Юзэф Бака быў яшчэ і выдатным, арыгінальным паэтам, вершы якога не цанілі пры жыцці. Ён напісаў кнігу «Увазе смерці няўхільнай». Яна не зусім трагічная, распавядае аб тым, што «смерць-сляпуха каля вуха. Бедны ты ці багаты, знакаміты або не, яна ўвесь час за табою сочыць. Так што старайся жыць так, нібыта жывеш апошні дзень, рабі дабро».

Пасля экскурсіі мы прагуляліся па старым парку, што на беразе ракі Цітаўка, папілі чысцюткай вады з крынічак, агледзелі рэшткі воднага млына, прайшліся сцежкай Бакі.

Затым пабывалі на Паповай горцы, дзе 28 верасня 1941 года расстраляна больш як 1200 яўрэеў. На гэтым месцы ўладкаваны мемарыял. Цяжка паверыць, што трагедыя адбылася ў такіх прыгожых мясцінах: злева — мястэчка Пухавічы, справа — Блонь, царква Святой Тройцы, крыху далей відаць Мар'іну Горку.

Спыніліся каля царквы Святой Жыватворнай Тройцы, пабудаванай у стылі класіцызму ў 1826 годзе — драўлянай, больш падобнай да ўніяцкай. Падыход да царквы, алтар, крыжы арыентаваныя на поўнач, а не на ўсход, як у традыцыйным праваслаўным храме. Царква ў фісташкавым колеры нібы пераліваецца пад сонцам. У 1944 годзе, пры вызваленні, па Блоні жахнуў залп «Кацюшы», выгарала ўсё сяло, але царква ацалела.

ПРЫПЫНАК У ПУСТЫНІ

У 1870 годзе статс-сакратар, міністр унутраных спраў Леў Макаў атрымаў маёнтак Навасёлкі з Падблонню над ракой Цітаўка, які быў секвеставаны ў Баніфацыя Крупскага за ўдзел у паўстанні 1863 года. У 1873-м хуткімі тэмпамі будуецца Лібава-Роменская чыгунка. Яна павінна была праходзіць за пяць кіламетраў ад сядзібы, але змяніла сваю траекторыю да сядзібы Макава. Да гэтай пары ў парку застаўся вяз-велікан: каб яго ахапіць, патрэбныя чатыры чалавекі. З 1880 года кар'ера Макава пайшла на спад. Пасля замаху на Аляксандра II яго вызвалілі з пасады міністра, абвінавацілі ў казённай растраце. Ён застрэліўся. Па распараджэнні цара пахаваны без ушанавання на Мар'інай Горцы ў храме, пабудаваным пад яго апекай. Гэта была копія царквы Святога Дзмітрыя ў Санкт-Пецярбургу, якую спраектаваў вядомы архітэктар Штром у грэчаскім стылі. «Наша царква была ўзведзена на 12 гадоў пазней. У Ленінградзе храм знеслі дзеля канцэртнай залы, на Мар'інай Горцы — проста так. Сведкам знішчэння ленінградскай царквы ў 1962 годзе стаў малады паэт Іосіф Бродскі. З гэтай нагоды ён напісаў верш «Прыпынак у пустыні», пазней у 1970 годзе ў ЗША выпусціў кнігу з аднайменнай назвай», — удакладняе Юрый Пятровіч.

Яшчэ адзін парадокс: Леў Макаў выступаў супраць усяго беларускага, польскага, але міжволі стаў рухавіком беларускай глыбінкі. Па яго ініцыятыве ў 1876 годзе было створана Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі для падтрымкі рускага землеўладання. Але праз нейкі час сюды ўвайшлі мясцовыя землеўладальнікі Леў Ваньковіч, Аляксандр Скірмунт, Эдвард Вайніловіч і іншыя. Менавіта дзякуючы Макаву ў Мар'інай Горцы была ўзведзена сельскагаспадарчая школа. Будаўніцтва ішло з 1877 да 1883 года. Акрамя галоўнага корпуса, былі пабудаваныя лазня, малачарня, хлявы для жывёлы. У школу прымалі дзяцей усіх саслоўяў. У 1911-м школа пераўтворана ў вучылішча, а ў 1921-м — у сельскагаспадарчы тэхнікум.

Тут захаваліся аб'екты першай пары: 150-гадовы каменны двухпавярховы будынак з пяціметровымі столямі, сценамі метровай таўшчыні, драўлянымі вокнамі, падлогай. Будынак складаецца з трох карпусоў — у левым жылі вучні, у правым — настаўнікі, а ў сярэднім месціліся вучэбныя класы.

Юрый ВАЖНІК *(на фота — злева)*.

САКРАЛЬНАЕ МЕСЦА

Завяршаецца наша падарожжа каля геаграфічнага Цэнтра Беларусі, які знаходзіцца непадалёк ад вёскі Антанова. Цэнтр Беларусі вызначылі спецыялісты «Белгеадэзіі» сумесна з фірмай «Аэрагеакарт». Дадзенае месца абазначана геадэзічным знакам.

На абочыне дарогі па ініцыятыве Юрыя Пятровіча ўсталяваны своеасаблівы стэнд-знак, дзе турысты могуць даведацца, у якім містычным і сакральным месцы яны пабывалі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
Пухавіцкі раён.

З рэгіёнаў

Воданапорную вежу ўкралі ў Шаркаўшчынскім раёне

Крадзеж года адбыўся ў вёсцы Рэчкі Шаркаўшчынскага раёна. Як паведамляе УУС Віцебскага аблвыканкама, тут укралі воданапорную вежу.

З заявай у міліцыю звярнуўся начальнік ААТ «Жвіранка». Вежа знаходзілася паблізу вёскі Рэчкі і нейкі час ужо не эксплуатавалася, але яшчэ лічылася на балансе ААТ.

Як устанавілі аператыўнікі, аб'ект вышынёй 10 м і масай каля трох тон выкралі трое жыхароў раёна. Мужчыны з дапамогай газавага разака дэмантавалі вежу, разрэзалі яе на часткі і здалі ў металалом. Частку ўкрадзенага ўдалося вярнуць. Сума шкоды складае амаль 1000 рублёў.

Бабуля Ганна сустрэла 100-годдзе і перамагла каранавірус

Нядаўна блізкія віншавалі жыхарку Маладзечна Ганну Андрэеўну Гулевіч са 100-годдзем. Па шматгадовай традыцыі, з векавым юбілеем нашых землякоў віншуюць і сацыяльная служба, раённы Савет ветэранаў. Аднак урачыстасць давялося адкласці: услед за сваякамі Ганна Андрэеўна заразілася каранавірусам, была на каранціне. Дзякуй Богу, хваробу перанесла няцяжка.

Як піша «Маладзечанская газета», да яе з падарункамі і цёплымі віншаваннямі завіталі старшыня раённага Савета ветэранаў Таццяна Шафаловіч, намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Людміла Пажарыцкая, кіраўнік дадатковага офіса № 504 «БПБ-Ашчадбанк» Рыта Дзмітрэнка, старшыня пярвічнай ветэранскай арганізацыі гэтага банка Наталля Ахвацюк. Здароўя, спакойных дзён сярод родных людзей, станоўчых эмоцый жадалі яны паважанай Ганне Андрэеўне. Прыязная ўсмешка ўпрыгожвала твар доўгажыхаркі. Адчуваецца, што яна вельмі светлы, добры чалавек.

Заўчасна пайшлі з жыцця яе сын Сяргей, дачка Тамара. І гэта для маці вечны боль, незагойныя раны сэрца. Чацвёра ўнукаў, пяцёра праўнукаў акружаюць доўгажыхарку клопатам і любоўю.

— Бабуля шмат працавала ў сваім жыцці, усіх нас старалася накарміць, адзець, — расказвае ўнук Юрый. — Яна прафесійная швачка, нямецкая нажная машынка «Зінгер» і дагэтуль стаіць у доме.

Перад пенсіяй Ганна Андрэеўна працавала прыбіральшчыцай у Маладзечанскім офісе аднаго з банкаў. Ёй было вельмі прыемна, што праз столькі гадоў там яе памятаюць.

Да 95 гадоў Ганна Гулевіч жыла ў сваім доме, блізкія ёй пастаянна дапамагалі. Калі стала цяжка спраўляцца, унук Юрый забраў жанчыну да сябе.

У Нясвіжы прайшоў творчы праект «Вяртанне да тэатральных вытокаў»

На два вечары ўнутраны дворык музея-запаведніка «Нясвіж» ператварыўся ў тэатральную пляцоўку. Месца правядзення фестывалю было абрана невыпадкова. Дзякуючы мецэнацтву Радзівілаў Нясвіж у XVI — XIX стагоддзях стаў культурнай мекай. У Нясвіжскім замку з 1640 года дзейнічаў першы ў Беларусі прыдворны тэатр, якім кіравала Францішка Уршуля Радзівіл.

Дарэчы, на працягу гэтых вечароў радаваў жыхароў і гасцей горада сваімі пастаноўкамі заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь — тэатр, які носіць імя Уршулі Радзівіл. Гледачам, у прыватнасці, быў прапанаваны спектакль «Ён — мужык, а яна — паненка» па п'есе Ж.-Б. Мальера «Жорж Дандэн, ці Абдураны муж», «Чорная панна Нясвіжа» па п'есе А. Дударава. Дзякуючы сведкамі якіх мы сталі ў гэтыя ліпеньскія вечары, паказалі, што тэатральныя традыцыі, закладзеныя ў мінулым, плённа развіваюцца і сёння. Дарэчы, як піша газета «Нясвіжскія навіны», у часы Радзівілаў у Нясвіжы ўпершыню ў Беларусі паставілі камедыі Мальера. Да спектакля «Ён — мужык, а яна — паненка», беларускі пераклад якога зрабіў Зміцер Ермаловіч-Дашчынскі, калектыў рыхтаваўся цэлы год.

Калі меркаваць па водгуках несвіжан, якія наведалі мастацкія імпрэзы, можна з упэўненасцю казаць, што ідэя кіраўніцтва раёна, музея-запаведніка і тэатральнага калектыву прыйшлася даспадобы жыхарам горада, і фестываль штогод будзе збіраць у палацава-паркавым комплексе прыхільнікаў творчасці заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь — тэатра імя Уршулі Радзівіл.

НА АДНЫМ ДЫХАННІ

З НЕЎРОЛАГАЎ У ПУЛЬМАНОЛАГІ

Маладая 20-гадовая мінчанка ішла ў паліклініку і страціла прытомнасць, у бальніцу яе прывезла «хуткая». 47-гадовая жанчына лягла ў клініку на планавае абследаванне, дзе выявілі вірусную пнеўманію. 28-гадовая дзяўчына прыйшла да ўрача закрываць бальнічны, а яе накіравалі на шпіталізацыю. Усіх гэтых жанчын рознага ўзросту аб'яднаў адзіны дыягназ і тое, як нечакана ён змяніў іх жыццёвыя планы. Усе яны сталі пацыенткамі пульманалагічнага аддзялення № 3 5-й гарадской клінічнай бальніцы. Да пандэміі яно было неўралагічнае, прычым прызначалася для хворых-спінальнікаў — людзей, якія атрымалі пашкоджанні пазваночніка, а разам з ім і параліч канечнасцяў. З красавіка 2020 года аддзяленне працуе як пульманалагічнае. А яго **загадчык Марыя КАНУННІКАВА** і ўрачы Алена Ліхачова і Марат Сарыеў (усе яны паводле спецыялізацыі неўролагі) цяпер лечаць хворых на каранавірусную інфекцыю.

— У неўралагічным аддзяленні ў нас была складаная катэгорыя пацыентаў — ляжачыя, нярэдка з гнойнымі ўскладненнямі. Часта ў іх здараліся застойныя пнеўманіі, таму праблем з перакваліфікацыяй у нашага калектыву не ўзнікла — з запаленнем лёгкіх мы мелі справу і раней, — адзначае Марыя Кануннікава.

Сёння ў аддзяленні, разлічаным на 40 ложкаў, праходзяць лячэнне пацыенты з COVID-19 сярэдняй ступені цяжкасці.

— Небяспека ў тым, што іх стан можа пагаршацца і пераходзіць у цяжкі. Такія выпадкі, калі нарастае дыхальная недастатковасць і даводзіцца пераводзіць пацыента ў рэанімацыю, здараюцца. У гэтым кавадства каранавірусная інфекцыі: прадказаць цячэнне хваробы магчыма не заўсёды, — тлумачыць урач.

Дарэчы, у разгар пандэміі ў 5-й клінічнай бальніцы, акрамя рэанімацыйнага, хворых прымалі сем аддзяленняў пульманалогіі.

КАЛЕКТЫЎ УДАЛОСЯ ЗАХАВАЦЬ

44-гадовая мінчанка Аксана другі тыдзень знаходзіцца ў аддзяленні пульманалогіі з вірусная пнеўманіяй. Яна ўражаная добразычлівасцю і пільнай увагай медыцынскага персаналу.

— Да хваробы я думала, што ўрачы трымаюцца ад заразных хворых на адлегласці. Аказалася, што гэта зусім не так. Наш палатны ўрач, доктар Мурат, падчас абходу падрабязна распытвае пра самаадчуванне кожную пацыентку, вымярае ціск, тэмпературу, адказвае на ўсе нашы пытанні. Пасля свой агляд робіць загадчык аддзялення Марыя Віктараўна, мы і яе мучаем сваімі сумненнямі — яна цярпліва і растлумачыць усё, і супакоіць. Любое пагаршэнне стану яна вызначае беспамылкова, — вельмі вопытны і прафесійны доктар. Медсёстры таксама ўсе вельмі прыязныя, хоць некаторыя і строгія, затое з выдатным пачуццём гумару, што заўсёды паднімае настрой у палаце, — расказвае жанчына.

Уважлівае стаўленне да пацыента — адзін з галоўных складнікаў і патрабаванняў да медперсаналу, тлумачыць **галоўны ўрач 5-й клінічнай бальніцы Міхаіл НАЗАРЧУК:**

— Пратаколы лячэння каранавіруснай інфекцыі стандартныя ва ўсіх. Аднак і падыход да пацыентаў вельмі важны — растлумачыць небяспеку COVID-19, кагосьці пераканаць у неабходнасці выканання рэкамендацый, той жа прон-пазіцыі, некага супакоіць — гэта такія ж абавязкі медыцынскага работніка, як і назначэнне медыкаментаў, правядзенне працэдур. Такую ўстаноўку і даём нашаму калектыву.

Марыя Кануннікава з гонарам кажа, што, нягледзячы на пандэмію, калектыў аддзялення ўдалося захаваць. Па стане здароўя год таму на пенсію сышлі дзве медыцынскія сястры. Пры гэтым засталося працаваць некалькі жанчын пенсійнага ўзросту. Адчуваецца, што бясспрэчным аўтарытэтам у калектыве карыстаецца Таццяна Аляксееўна Ліцкевіч *(на калектыўным фота — у цэнтры)*. Толькі ўявіце: на работу ў неўралагічнае аддзяленне яна прыйшла 44 гады таму, адразу пасля заканчэння медыцынскага вучылішча. Пра яе кажуць, што сваімі рукамі яна выхадзіла сотні пацыентаў-спінальнікаў. Пасля пачатку пандэміі, нягледзячы на паважны ўзрост і звязаныя з ім рызыкі, яна штодзень у касцюме індывідуальнай аховы разам з калегамі працуе ў чырвонай зоне. Гэтак жа, як Святлана Леанідаўна Проніна, якая аддала медыцыне 37 гадоў, Святлана Мікалаеўна Шымко, яе стаж у аддзяленні — 18 гадоў. Чалавекам з залатымі рукамі пацыенты называюць працэдурную медсястру Алену Свержаву, якая працуе ў аддзяленні два дзесяцігоддзі.

— Гэтыя медсёстры не даюць сабе паблажак у рабоце, яны — мая надзейная апора, — кажа загадчык аддзялення. — Іх можна ставіць на любы ўчастак — працэдурнай медсястрой, на перавязкі, на пост. Ёсць і нямала санітарак, якія ў нас шмат гадоў, напрыклад, з 1983 года працуе Любоў Дзмітрыеўна Бразгоўка. Радуе, што ў наша няпростае аддзяленне прыходзяць і маладыя спецыялісты пасля медыцынскіх каледжаў. Умовы работы, асабліва ў летнюю спёку, складаныя: у супрацьчумных касцюмах арганізм перагараецца, калі здымаеш ахоўны камбінезон, ніжні касцюм цалкам мокры. Але ўсе прызвычаіліся, разумеюць, што гэта неабходна. Пандэмія яшчэ больш з'яднала ўвесь наш калектыў.

У аддзяленні працуюць 30 чалавек, у тым ліку 12 медсясцёр на чале са старшай медсястрой Таццянай Нячай і 11 санітарак. Марыя Кануннікава ўзначальвае яго шэсць гадоў. Да гэтага 15 адпрацавала ў раённых бальніцах — спачатку ў Петрыкаўскай, затым — у Мазырскай гарадской.

Рабочы дзень загадчыка аддзялення паводле раскладу пачынаецца ў 8.30, але на рабоце Марыя Кануннікава ўжо а восьмай. На ранішняй планёрцы начная змена інфармуе пра пацыентаў, якія паступілі, дзяжурны ўрач расказвае, каму і якая патрабавалася дапамога. Штодзень складаюцца спісы пацыентаў па палатах з іх данымі — тэмпература, сатурацыя, ціск і іншыя паказчыкі, так што доктар можа адразу бачыць, у якім стане пацыент, і яго дынаміку. Далей урачы робяць абыход. Калі палатны ўрач аглядае 20 хворых, то загадчык аддзялення мусіць агледзець усіх, а гэта чатыры дзясяткі пацыентаў. Па дакументах рабочы дзень заканчваецца ў 15.30, аднак з пачатку пандэміі Марыя Кануннікава так рана з бальніцы ніколі не сыходзіла — «Ты вольны, толькі тады, калі ўсё зроблена», — кажа ўрач.

«УСЕ НАШЫ ПАЦЫЕНТЫ, ЯКІМ ЗА 90, ВЫЖЫЛІ»

Падыходы да лячэння COVID-19 мяняюцца з назапашваннем новай інфармацыі і даных даследаванняў, якія праводзяцца ў свеце.

— Падыходы да лячэння пераглядаюцца. У параўнанні з пачаткам пандэміі мы сталі лепш разумець, як паводзіць сябе вірус і як лячыць пацыента. Спачатку ўсім прызначалі антыбіётыкі, цяпер яны прымяняюцца толькі ў выпадку, калі далучаецца бактэрыяльная флора, — кажа Марыя Кануннікава.

— Ці складана вызначыць, што ў пацыента здарылася тромбаэмбалія?

— Гэта адно з грозных ускладненняў COVID-19. Маецца адпаведная клінічная карціна — падаюць ціск і сатурацыя, пэўнае адценне набывае скура. Тут інфарматыўныя паказчыкі аналізаў, і абследаванняў, якія выконваюцца пры падазрэннях на гэты дыягназ. Усе ўрачы навучаны вызначаць такі небяспечны стан і бачылі яго не раз. На жаль, гэта нярэдкая сітуацыя, якая патрабуе неадкладнай дапамогі, пацыенту адразу выклікаюць урача-рэаніматолага. Пра ўсе магчымыя наступствы нам падчас навучання расказваюць спецыялісты, якія да нас прыязджаюць з лекцыямі па лячэнні COVID-19, у тым ліку інфекцыяністы.

— Яшчэ адзін небяспечны стан — цытакінавы шторм...

— На мінулым тыдні ў нас было чатыры пацыенты, у якіх ён пачынаўся. Толькі аднаго з дыхальнай недастатковасцю даставілі ў рэанімацыю, ён на кіслародзе, але таксама ідзе на папраўку. Стан астатніх удалося палепшыць у аддзяленні. На наступны дзень яны сталі адчуваць сябе нашмат лепш. Ёсць эфектыўныя прэпараты розных фармакалагічных груп, якія нядрэнна сябе зарэкамендавалі і дапамаглі выратаваць шмат людзей.

— Апошнім часам шмат кажуць пра індыйскі штам, ці ёсць такія хворыя ў стацыянары?

Медсястра Святлана ПРОНІНА.

— Так, мы назіраем, што ў некаторых пацыентаў іншыя сімптомы. Пры індыйскім штаме няма парушэнняў нюху, пры якіх назіраецца сухасць слізістых, а ёсць ярка выражаны рыніт — што называецца, «цячэ ручаём». Таму яго складана адрозніць ад іншай ВРВІ. Маюцца і страўнікава-кішэчныя расстройствы. Такіх пацыентаў пакуль не большасць, і складаных выпадкаў у нас не было, але трэба ўлічваць, што назіраць мы гэты штам пачалі нядаўна.

— Ці можа каранавірусная пнеўманія працякаць бессімптомна?

— Так, сцёртыя формы назіраюцца. Але зусім без тэмпературы, хоць бы субфібрыльнай, пнеўманія, як правіла, не абыходзіцца.

— Якія хворыя трапляюць у стацыянар — калі маецца аб'ёмнае запаленне лёгкіх?

— Сярод паказанняў да шпіталізацыі не толькі аб'ём паражэння лёгкіх. Значэнне мае і інтаксікацыйны сіндром. Выражаная інтаксікацыя назіраецца і з неістотным паражэннем лёгкіх. Высокая тэмпература, чалавек не можа ні есці, ні піць, пры гэтым рвота ці панос, а пнеўманія — усяго 5 %. Нельга выключыць, што на наступны дзень аб'ём паражэння не павялічыцца. Здараецца, што пацыент паступае з 5-7 %, але з выражанай інтаксікацыі, тэмпературай пад 40, а праз некалькі дзён падае сатурацыя, і на здымку мы выяўляем 70 ці 80 % паражэння лёгкіх. Запаленне можа развівацца імкліва. Таму адмаўляцца ад шпіталізацыі не варта.

— Ці трапляюць у стацыянар людзі, якія зрабілі прышчэпкі ад COVID-19?

— У нас было ўсяго трое вакцынаваных пацыентаў, захворванне ў іх працякала ў няцяжкай форме. У двух з іх была адна доза вакцыны, і тут пытанне, ці не былі яны інфікаванымі яшчэ да прышчэпкі.

— Ад чаго залежыць, як будзе працякаць каранавірусная інфекцыя?

— Найперш ад стану імунітэту. У нас былі пацыенты, у якіх і пасля хваробы не выпрацоўваліся антыцелы. Супрацьлеглая сітуацыя — гіперімунны адказ, калі пачынаецца цытакінавы шторм.

— Як хутка пацыенты аднаўляюцца?

— Тут усё індывідуальна. Былі хворыя з 90-95 % паражэннем лёгкіх, якіх пераводзілі з рэанімацыі, і праз 21 дзень яны выпісваліся ў добрым стане. Ёсць пацыенты пасля цытакінавага шторму, якіх мы купіравалі, і яны адразу просяцца на выпіску. Мы тлумачым, што застаецца рызыка ўскладненняў, у тым ліку вельмі небяспечнай тромбаэмбаліі. Таму тут не трэба спяшацца дадому.

— Якія ў вашай рабоце моманты самыя цяжкія?

— Калі не ўдалося выратаваць пацыента, нягледзячы на тое што зрабілі ўсё магчымае. Калі чалавек гіне, усе ў аддзяленні ўспрымаюць, быццам бы не стала твайго блізкага. Балюча і цяжка, калі чыёсьці жыццё заканчваецца. І наадварот, прыемна, калі цяжкі пацыент папраўляецца. І ты ўсведамляеш, што стан быў складаны, з дыхальнай недастатковасцю, з цытакінавым штормам, але правільна падабралі лячэнне, і чалавек папраўляецца. Дарэчы, у нас былі і ўзроставыя пацыенты, якім за 100 гадоў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Яны вельмі баявыя, вялі актыўны спосаб жыцця, вялікія аптымісты — ніхто з іх, нават апынуўшыся ў бальніцы, не збіраўся паміраць. І прыемна адзначыць, што ўсе нашы пацыенты, якім было за 90, выжылі.

«АЛЬТЭРНАТЫВЫ ВАКЦЫНАЦЫІ ПАКУЛЬ НЯМА»

Марыя Кануннікава ўпэўненая, што адзіным спосабам, які засцеражэ ад цяжкага цячэння каранавірусная інфекцыі, з'яўляецца прышчэпка. У сям'і медыка вакцынаваныя ўсе: дочкі, зяць, муж, таксама ўрач, і яна сама.

— Альтэрнатыву вакцынам, якая б дапамагла перамагчы заразнае захворванне, пакуль не прыдумалі. Таму ў маёй сям'і нават пытанне не ўзнікала наконт прышчэпак. У пачатку пандэміі, калі вакцын не існавала, многія перажывалі паніку. Ды і цяпер нямала нашых пацыентаў з каранавірусная інфекцыяй думае, што яны загінуць. Псіхатэрапеўт кожны дзень працуе з імі ў аддзяленні. Таму вакцына — не толькі выратаванне ад цяжкіх выпадкаў і смерці, але і маральнае заспакаенне. Па-за сценамі бальніцы, на жаль, сёння іншая сітуацыя — у транспарце, магазінах людзі не носяць масак, не захоўваюць бяспечную дыстанцыю. Гэта, вядома, вельмі сумна.

Паводле інфармацыі **намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай экспертызе і рэабілітацыі 5-й гарадской клінічнай бальніцы Казіміра ГАЙДЭЛЯ**, 78 % супрацоўнікаў медыцынскай установы ўжо атрымалі прышчэпкі ад каранавірусная інфекцыі. Астатнія перахварэлі і пакуль маюць імунітэт.

Алена КРАВЕЦ, фота аўтара.

Калектыў пульманалагічнага аддзялення № 3.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

НА ЯКОЙ МЫТНІ НЕ ПРОЙДЗЕШ БЕЗ АНЕКДОТА

Аўцюкоўскія «Каласкі» і «Калінкі» зноў даказалі, што іх куточак на Калінкавіцкай зямлі — сапраўдная беларуская сталіца гумару. У чарговы раз аграгарадок Малыя Аўцюкі сабраў найлепшых гумарыстаў, жартаўнікоў-аптымістаў і вясковых «стэндаперaў» з усіх рэгіёнаў Беларусі. Тут прайшоў юбілейны дзясяты фестываль народнага гумару «Аўцюкі-2021».

Дарэчы, самі тутэйшыя жартаўнікі сваю малую радзіму правінцыяй не лічаць. Яны папулярызуюць тутэйшую мову, вераць, што ёсць у Беларусі асобная аўцюкоўская нацыя, а райцэнтр Калінкавічы — гэта ўсяго толькі прыгарад Аўцюкоў. Тое, што менавіта тут беларуская сталіца гумару, ужо прызнана не толькі ўдзельнікамі фестываляў, а і гасцямі з іншых краін. Прыцягальная і незвычайная дзёрзкасць аўцюкоўскіх гумарыстаў. Вядома ж, тутэйшыя «Каласкі» і «Калінкі», што кінулі выклік гарадскім папулярным жартаўнікам, узносяць беларускі народны гумар на новую арбіту — як нацыянальны брэнд.

— Кажуць адной аўцючцы: «Го, твайго Івана на Алімпіядзе наградзіў нехта каранавірусам». Яна ў адказ: — «Ды мой дурань усё роўна дадому не данясе, або згубіць, або прап'е», — жарты на злабадзённыя тэмы чуваць адразу ж на «ўваходзе» на фестываль. Так, у краіны гумару ёсць свая мытня. Каб прайсці яе, трэба прад'явіць «ўваходны білет» — жарт, анекдот або прыпеўку. Вядома ж — замест пашпарта на аўцюкоўскай мытні правяраюць наяўнасць пачуцця гумару!

Нягледзячы на тое што сёлета COVID-19 прадыктаваў свае ўмовы (звычайна прыязджала да паўтысячы ўдзельнікаў з розных краін), фестываль традыцыйна выдаўся «гарачы» — ураджайны на жарты і весялосць. На аўцюкоўскай мытні, напрыклад, быў затрыманы «падазроны грамадзянін»:

— Новая форма артыста эстрады са старым зместам, — перапрануты пад мясцовага «Каласка», выходзіць з вобраза госць фестывалю — **майстар пародыі і гумару, нязменны Дзед Мароз Беларусі Уладзімір РАДЗІВІЛАЎ.** — Першы фестываль прапусціў з-за здымак, а ва ўсіх астатніх — абавязкова бяру ўдзел у журы. Магу запэўніць, што з кожным годам фестываль набірае сваю моц, збірае шмат людзей, якія шчыра любяць гумар.

Між тым, падлічана: за час правядзення аўцюкоўскага гумарыстычнага фэсту ў ім узяло ўдзел звыш 150 творчых калектываў і каля трох з паловай тысяч удзельнікаў, творчых дэлегацыі з Расіі, Украіны, Літвы, Балгарыі. За гэты час гасцямі фестывалю стала некалькі дзясяткаў пісьменнікаў, паэтаў, артыстаў. У Аўцюках на святах гумару прыдумана і агучана больш за тысячу анекдотаў.

У гонар юбілею свята была працягнута традыцыя закладваць сімвал фестывалю. Цяпер гэта камень-валун з захраслай у ім пілой, маўляў, «выканаць невыканальнае» можна толькі талакой.

Афіцыйную частку форуму адкрылі парад-шэсце з песнямі пад гармонік і прывітанне-віншаванне творчых дэлегацый. Пасля ўрачыстага адкрыцця прайшла жартаўлівая каранацыя «гумарыстычнага манарха» Малых Аўцюкоў — **беларускага пісьменніка, знакамітага ідэйнага натхняльніка фестывалю Уладзіміра ЛІПСКАГА.**

— У Аўцюках усё ідзе ад душы і ад сэрца. Тут усе імкнуцца весяліцца так, каб хацелася жыць. Гэта народная мудрасць. Накормішся вітамінамі гумару, каб яны падсілкоўвалі ўвесь год, і павязеш з сабой, каб распаўсюджваць па ўсёй Беларусі, — звярнуўся да аматараў гумару Уладзімір Ліпскі.

У інтэрв'ю журналістам ён прызнаўся: адно з галоўных дасягненняў свята ў тым, што аўцюкоўцы паверылі — яны вызначаюцца незвычайнай якасцю.

— Яны шчыра чакаюць гэтага фестывалю, рыхтуюць новыя жарты, імкнуцца быць завадатарамі гумарыстычнага руху. Яны ўжо адказваюць за беларускі культурны брэнд, падаюць прыклад усім беларусам — давайце цаніць кожнае імгненне жыцця, цаніць яго «хвілінную стрэлку», давайце весяліцца, быць мудрымі, тады будзе хацецца жыць, як тут кажуць, — перадае зарад аптымізму Уладзімір Ліпскі.

Ён марыць, каб студэнты-філолагі прыязджалі менавіта ў гэты край у моўную экспедыцыю, бо варта сабраць і захаваць усе выслоўі. А такі збор, на думку пісьменніка, дасць глебу для творчасці літаратарам, тэатралам, «кіношнікам».

Гасцей і ўдзельнікаў фестывалю цёпла вітаў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

— Кажуць: ёсць тры праявы Бога на зямлі — прырода, любоў і пачуццё гумару. Прырода дапамагае жыць, любоў — выжыць, а пачуццё гумару — перажыць. Жартуйце лёгка, па-добраму, з любоўю. Бо гумар, па сутнасці, лекі ад болю. Калі чалавек умее жартаваць, то ўсё яго жыццё становіцца прасцейшае і лепшае, — параіў кіраўнік рэгіёна.

Яму, прынамсі, на фестывалі было прысвоена пачэснае званне «Ганаровы аўцюк».

Гасцей чакалі традыцыйныя гумарыстычная падворкі. На адзін з іх вабілі гукі аўцюкоўскага «аргана». Па «легендзе» Алена Драпеза, супрацоўніца Дома культуры з вёскі Савічы Калінкавіцкага раёна, займаецца адборам артыстаў для ансамбля «Запойцы».

— Сёння ў нас жартоўныя пробы ў калектыў, будзем праводзіць кастынг талентаў і прэзентаваць новы інструмент — аўцюкоўскі «арган» з розных бутэлек. Сама перад фестывалем яго прыдумала, а муж дапамог сабраць, — дзеліцца Алена Драпеза і, скарыстаўшыся магчымасцю, прэзентуе журналістам блок аўтарскіх матываў: «Што на бульбе калорады, пераспелі агуркі — не да гэтага нам сёння, бо мы едзем у Аўцюкі!»

Старшыня Капліцкага сельсавета Генадзь Кавальчук і **старшыня Шыіцкага сельсавета Аляксандр ФРАЛОЎ** (Калінкавіцкі раён) напаткалі на падворку

«Хутаран». Іх слоган — «Лепш круціць шуры-муры, чым шурумбурум». Генадзь Кавальчук дае самую трапную характарыстыку, хто ж такія аўцюкоўцы:

— Аўцюк — гэта вельмі кемлівы чалавек. Яшчэ са старажытных часоў ведалі пра яго вынаходлівасць. Вось вам усе гавораць, што сёння дзясяты фестываль, а гэта не так. Нулявы фестываль адбыўся, калі нашы хлопцы-аўцюкоўцы пайшлі ў Юравічы тачыць нажы. Там такая невялікая «Швейцарыя», дзе аўцюк пускаў з гары камень, а пакуль ён каціўся ўніз, даганяў і аб яго нож вастрыў. Яшчэ, як вярталіся дадому, то па дарозе ўгналі ў юравіцкіх хлопцаў статак маманаграгарадка Спорава (Бярозаўскі раён, Брэсцкая вобласць).

— Страшнавата ўдзельнічаць, бо думаеш, як не падкачаць, — дзеліцца Ніна Пашкевіч. — У сцэнарыі ж галоўнае — не баяцца смяяцца з сябе.

Удзельніца народнага тэатра мініяцюр «Веснік» з Зялёнкаўскага сельскага Дома культуры Алена Фурс прызнаецца, што полацкія гумарысты адчуваюць сябе ў Аўцюках як дома.

— Народны гумар жыве не толькі на сцэне. Толькі на гумары, як кажуць, і трымаемся. Беларусы ўвогуле такая нацыя, якая ўмее папрацаваць шчыра, а потым добра адпачыць, а які ж адпачынак без гумару, без жартаўлівай песні? І на сцэну гумар прыходзіць менавіта з жыцця. Мы з вёскі, таму ў нас і жарты пра працу ды мужыкоў, што не ляноюцца чарку выпіць і шкварку з'есці, на рыбалку вышмыгнуць. Жартуем і пра спрадвечнае жаночае пытанне, — кажа Алена Мікалаеўна.

Удзельнікі фестывалю ўпэўненыя: культурная прастора Аўцюкоў — назаўжды цэнтр прыцягнення ўсіх аматараў гумару, які, як вядома, яднае! Ёсць у іх мара прыцягваць на свята жартаўнікоў-аматараў ад усіх малых народнасцяў, што жывуць на Беларусі, якія змогуць раскрыць у Аўцюках і свой адметны нацыянальны гумар.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота аўтара і БелТА.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», г. Минск, пр-т Партизанский, 174**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Правильно-гибочный автоматический центр FORMULA 14 EVO,

г. в. 2014, инв. номер 41204.

Месторасположение: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 174

Начальная цена лота с НДС 20 % – 145 382,40 бел. руб.

Условия самовывоза и демонтажа	Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 21.04.2021 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 25.08.2021 в 12.00. Окончание торгов: 25.08.2021 в 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.08.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519) 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел.: +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **03 сентября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Капитальное строение, инв. № 343/С-94164, пл. 1266,0 кв. м, (Дом быта) Гомельская обл., г. Хойники, ул. Карла Маркса, 27	163 800,00
2	Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4198	5,00
3	Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4199	5,00
4	Станок для изготовления ключей, 2005 г. в., инв. № 4204	65,00
5	Пресс дублирующий Comel PLT-1100, 2013 г. в., инв. № 4262	1800,00
6	Ламинатор Ibico PouchMaster PQ. 2013 г. в., инв. № 7092	60,00
7	Рейсмусовый станок односторонний, модель СР-3, 2007 г. в., инв. № 4213	1800,00
8	Станок торцовочный круглопильный, модель Ц6-2М1, 2012 г. в., инв. № 5015	1700,00
9	Гидравлический подъемник для легковых автомобилей, модель ПР-3, 2007 г. в., инв. № 4235	1700,00
10	Шиномонтажный станок «SEMIAUTOMATIC», модель С601, 2007 г. в., инв. № 4210	600,00
11	Машина балансировочная, модель ЛС1-01, 2007 г. в., инв. № 4211	600,00
12	Компрессор, модель К-1, 2007 г. в., инв. № 4225	300,00

Местонахождение: п. 1–3 – Гомельская обл., г. Хойники, ул. К. Маркса, 27, п. 4–6 – г. Гомель, ул. Катунина, 14, п. 7–12 – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77.

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.00 04.08.2021 г. по 17.00 02.09.2021 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 24.06.2021 г.

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926, г. Минск, ул. Л. Украинки, д. 16, каб. 6), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 18 августа 2021 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 03 августа 2021 года по 16 августа 2021 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «ТРИУМФСТРОЙ» (УНП 190465926)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, рублей без учета НДС	Шаг торгов	Задаток
1	Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161391, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-126, площадь – 17,8 кв. м	**16 800,00**	**5 %**	**5 %**
2	Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161392, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-135, площадь – 17,3 кв. м	**16 800,00**	**5 %**	**5 %**
3	Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161393, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-137, площадь – 16,1 кв. м	**16 800,00**	**5 %**	**5 %**
4	Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161404, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-149, площадь – 13,2 кв. м	**16 030,00**	**5 %**	**5 %**
5	Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161398, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-150, площадь – 13,1 кв. м	**16 030,00**	**5 %**	**5 %**
6	Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161399, назначение-машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-151, площадь – 13,3 кв. м	**16 030,00**	**5 %**	**5 %**
7	Изолированное помещение, инв. номер по ЕГРНИ 500/D-708161400, назначение – машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Жуковского, 29Б-152, площадь – 13,3 кв. м	**16 030,00**	**5 %**	**5 %**

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 16.00 **16 августа 2021 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 16.00 16.08.2021 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;

- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенного соглашения в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 89 (29458) за 14.05.2021.

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «Телеханский завод столярных изделий» (УНП 200099487), объявляет о проведении **18.08.2021 г. с 9.00 до 16.00** на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:

Лот 1. ОАО «Телеханский завод столярных изделий», предприятие как имущественный комплекс с регистрационным номером 0001436.

Начальная стоимость: 1 659 200 бел. руб.

Минимальная стоимость: 1 348 100 бел. руб.

Размер задатка: 5 % от начальной стоимости имущества в размере 82 960 бел. руб.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества в размере 82 960 бел. руб.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «Телеханский завод столярных изделий».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; **contact@bankrottorg.by.**

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 5 % от начальной стоимости лота не позднее 17.08.2021г. на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933 в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются **с 9.00 02.08.2021 по 17.00 17.08.2021 на bankrottorg.by**. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде, по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);

- устав юридического лица;

- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;

- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ и за публикацию объявлений в СМИ 5593,71 бел. руб., стоимость размещения объявления в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» согласно счет-фактуре, стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, аукционный сбор – 1 % от конечной цены предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения электронных торгов в сумме 300 000 бел. руб. без НДС; в течение календарного года оплата равными частями оставшейся суммы предмета торгов.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДА ДЛЯ ХРАНЕНИЯ МАТЕРИАЛОВ (МИНЕРАЛЬНЫХ УДОБРЕНИЙ)

с инв. № 600/С-170635 общей площадью 1 197 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623685800001000446 площадью 0,7004 га *(право постоянного пользования)* по адресу: Минская область, Минский район, Шершунский с/с, 26, район д. Новый Двор.

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель т. к. часть участка пл. 0,6977 га расположена в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 138 713,14** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 13 871,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **06.09.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.09.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: 8 (017) 504 83 58, 8 (029) 162 40 72.

УНН 600068728

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91»

Лот № 1:

ПОМЕЩЕНИЕ ТРАНСПОРТНОГО НАЗНАЧЕНИЯ

с инв. № 500/D-708117116, 479,5 кв. м,
адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 48Б-2.

Обременение: аренда (информация на сайте ino.by).

Начальная цена с НДС – 244 534,75 бел. руб.

Задаток – 24 453,47 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 18.08.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – **16.08.2021 в 11.00.**

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Прыкметы часу

ЕЖА ПА-ІНШАМУ

Чым можна падсілкавацца і навошта гэта ядуць

Чалавек актыўна змяняе навакольны свет, і харчаванне — не выключэнне. У дадзенай сферы, дарэчы, таксама ёсць мода. Што б такога з'есці, калі сам не ведаеш, чаго хочаш? Расказваем.

«КОРМ ЧАЛАВЕЧЫ, АДЗІН ЛІТР»

Калі вы гарталі старадаўнія кулінарныя кнігі, то не маглі не заўважыць, наколькі доўга гатуюцца аўтэнтычныя стравы. Але жыццё паскараецца, і часу на гатаванне ежы ў сучаснага чалавека застаецца ўсё менш. Прызнайцеся, купляючы корм кату, вы не лавілі часам сябе на думцы: вось бы ў краме можна было купіць і «корм чалавечы, 0,5 кг»? Уласна, з недахопу часу і нарадзілася ідэя «заменнікаў ежы». Першую версію прыдумаў у 2013 годзе праграміст Роб Райнхарт (работа ў праекце займала ў маладога чалавека практычна ўвесь час, так што нават проста паесці стала праблемай — пры гэтым харчавацца булачкамі з колай ён не хацеў). Падышоўшы да пытання сістэмна, Райнхарт набыў 35 інгрэдыентаў, неабходных арганізму штодня: глюканат калію, карбанат кальцыю, монанатрыйфасфат, розныя вугляводы, аліўкавы алей, поліненасычаныя тлустыя кіслоты і г. д. і ўзбіў усё гэта ў блэндары. Так ён атрымаў кактэйль, які не надта ўдала назваў «Сойлент» (ад англ. soybean — соя і lentil — сачавіца). Назву гэтую прыдумаў фантаст Гары Гарысан — яна сустракаецца ў яго кнізе пра свет будучыні, напісанай яшчэ ў 1960-х. Дзеянне ў рамане адбываецца ў нашы дні (дакладней, у 2022 годзе). Па сюжэце, перанасяленне, глабальнае пацяпленне і экалагічныя катастрофы прывялі да таго, што прадуктаў харчавання не хапае, і вялікая частка чалавецтва сілкуецца заменнікам ежы з назвай «Сойлент». У канцы кнігі высвятляецца, што робяць яго з... памерлых людзей, так што — назва сапраўды няўдалая. А вось сама «ежа будучыні» многім спадабалася: зусім новая «кулінарная вынаходка» хутка стала папулярная ў прыхільнікаў здаровага спосабу жыцця, у тых, хто худзее, у мэтанакіраванай моладзі і проста ў аматараў усяго новага. Блогеры, аўтары кулінарных часопісаў і сайтаў сталі пісаць і здымаць рэпартажы пра тое, колькі яны змаглі пратрымацца на заменніку ежы і што адчувалі.

«Сойлент» — гэта парашок, які раствараюць у вадзе, атрымліваючы кактэйль, што змяшчае ўсе рэчывы, неабходныя для падтрымання жыццядзейнасці чалавека. Сам Райнхарт пражыў на «Сойленце» (без усялякай іншай ежы) больш за два месяцы, паступова ўдаскональваючы яго састаў: у прыватнасці, дадаў жалеза і клятчатку. Ён адзначаў, што працэс гатавання ежы стаў займаць у яго хвіліну, ён адчуў прыліў сіл, а выдаткі на харчаванне знізіліся больш чым у тры разы. Праўда, у рэшце рэшт стваральнік «смарт-ежы» вярнуўся да нармальных прадуктаў. Сёння «Сойлент» прадаецца з першапачатковым нейтральным смакам, са смакам шакаладу і ванілі.

Назва стала зборнай — цяпер «сойлентамі» называюць усе падобныя парашкі. Услед за першым з'явіліся і іншыя варыянты «ежы будучыні». Фінскі варыянт сойлента — Ambronite — змяшчае ўжо больш інгрэдыентаў, прычым стваральнікі пішуць, што ў складзе — натуральныя прадукты: арганічныя яблыкі, арганічная аўсянка, арганічны какос і г. д. У краінах Заходняй Еўропы распрацавана Mana: соевы пратэін, аўсянка, кукуруза, сланечнікавы алей, алей з водарасцяў і г. д. А стваральнікі парашку Joylent зрабілі акцэнт на смаках: у іх кактэйляў досыць шмат напаўняльнікаў (манга, суніцы, банан і г. д.). Ёсць і расійскі варыянт — парашок Smart Food (Russian Soylent). Парашкі для гатавання кактэйляў-заменнікаў ежы выпускае сёння досыць шмат кампаній. Некаторыя пазіцыянуюцца як здольныя цалкам замяніць харчаванне, іншыя прызначаныя для замены аднаго прыёму ежы (напрыклад, вячэры) і выкарыстоўваюцца для пахудзення.

— Асабіста я супраць падобных эксперыментаў з харчаваннем, — падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара РУП «НПЦ НАН Беларусі па харчаванні» Алена МАРГУНОВА.**

Перш за ўсё, кажа спецыяліст, цэлае далёка не заўсёды можна замяніць сумай частак. І штучна пабудаваць настолькі шматузроўневую сістэму, як паўнавартасны рацыён, проста змяшаўшы інгрэдыенты, наўрад ці магчыма.

— Так, існуе ўсярэдненае ўяўленне пра тое, які набор вітамінаў і мінералаў неабходны чалавеку для здароўя — зыходзячы з гэтага ўяўлення, распрацоўваецца састаў падобных сумесяў. Але сёння дыетолагі кажуць аб неабходнасці персаніфікаванага падыходу да рацыёну кожнага канкрэтнага чалавека.

Сэнсорыку (арганалептычныя ўласцівасці прадукту, якія ўключаюць смак, колер, кансістэнцыю, водар і інш.) таксама ніхто не адмяняў.

— Ежа павінна быць прывабная знешне, падабацца чалавеку па смаку, мець свае, адметныя колер і водар. Мы прывыклі, што клубніцы чырвоныя, а смажаная курачка — залацістая з непаўторным пахам. Для правільнага засваення ежы вельмі важныя правільная падача страў і сервіроўка стала. А калі намяшаць каламутнай бурды, знікае задавальненне ад ежы і гэта парушае баланс усіх сістэм арганізма. Чалавечая псіхіка і ферментныя сістэмы не прыстасаваныя — пакуль, сама меней — да падобнага спосабу атрымання пажыўных рэчываў на працягу колькі-небудзь доўгага часу.

І самае галоўнае, падкрэслівае спецыяліст: заменнікі ежы цалкам выключаюць жаванне. Наш арганізм і стрававальная сістэма, у прыватнасці, уладкаваныя такім чынам, што адмова ад цвёрдай ежы можа аказаць негатыўны ўплыў. Жаванне ачышчае зубы і абараняе іх ад зубнога налёту і карыесу. Дзясны ўшчыльняюцца і лепш утрымліваюць зубы. Прадукты, якія маюць патрэбу ў ператраўліванні, стымулююць маторную актыўнасць страўніка і кішэчніка. Адбываецца працэс выпрацоўкі ферментаў і страўнікавага соку. Калі ўжываць толькі вадкую ежу, то ўсе гэтыя працэсы арганізма паступова знікнуць. Пры адмове ад цвёрдай ежы парушаецца работа рэцэптараў поласці рота, пачынаюцца працэсы дыстрафіі зубоў і слізістай ротавай поласці. Маторыка СКТ знізіцца да мінімальнай, што прывядзе да росту патагенаў у арганізме, а таксама парушэння сінтэзу шэрага вітамінаў.

Вадкую ежу наш арганізм успрымае як дадатак, а не асноўны сродак насычэння, таму для правільнага функцыянавання арганізма цвёрдую і вадкую ежу неабходна спалучаць.

І яшчэ адзін аргумент: у нашых умовах «заменнікі ежы» абыходзяцца дорага — не танней за звыклы рацыён. Так што пры ўсіх мінусах з плюсоў застаецца толькі эканомія часу. Ну і магчымасць адчуць сябе «біяхакерам».

«НОВЫ ТВАР» ЕЖЫ

Калі мэта стварэння «заменнікаў ежы» была чыста ўтылітарная, то малекулярная кухня стваралася з мэтай процілеглай — сібарыцкай: надаць звыклым прадуктам нязвыклы выгляд, папесціць едака і «здзівіць» яго смакавыя рэцэптары.

Малекулярная кухня — таксама плён навукоўцаў. Адзін час вядомыя кухары, у тым ліку ў Беларусі, спрабавалі сумясціць нацыянальныя традыцыі з новым тады кірункам кулінарыі. А модныя дзяўчаты нават спрабавалі паўтарыць найбольш простыя стравы малекулярнай кухні на кухні ўласнай. Пачынальнікі кулінарнага напрамку — фізік Нікалас Курт і хімік Эрве Ціс — яшчэ ў 1990-х прапанавалі паглядзець на звыклыя рэцэпты праз прызму фізічных і хімічных працэсаў. Такім чынам кухня ператвараецца ў лабараторыю, дзе выкарыстоўваюцца тэхнічныя інавацыі. Кухару варта ўмець эмульсіраваць, ферменціраваць, прымяняць сферыфікацыю і тэхналогію дэгідрацыі, гатаваць з дапамогай вакууму і высокага ціску. У выніку атрымліваем «іншапланетны» выгляд страў: вадкі хлеб, цвёрды боршч або, напрыклад, селядзец «пад футрам» у выглядзе мусу. Малекулярная кухня — гэта не пра «паесці»: як правіла, порцыя не перавышае некалькіх лыжак, а каштуюць стравы вельмі нятанна. Кухары сцвярджаюць, што сучасныя тэхналогіі дазваляюць захаваць усе карысныя ўласцівасці зыходных прадуктаў. Дыетолагі кажуць, што малекулярная кухня выключае традыцыйныя для кулінарыі «шкоднасці» накшталт смажання ў алеі. Але ў цэлым на карыснасць ці шкоднасць страў уплываюць дабаўкі, якія выкарыстоўваюцца для дасягнення патрэбнай кансістэнцыі дабаўкі (эмульгатары і гідракалоіды). Калі яны натуральныя — усё добра. Калі больш танныя, можна атрымаць нястраўнасць.

КОСМАС І ЖЫЦЦЁ

Ежа для касманаўтаў — аказваецца, самы новы трэнд у харчаванні. Да нас мода пакуль не дакацілася, але ў Маскве, распавядаюць дыетолагі, такая тэндэнцыя набірае папулярнасць.

Памятаеце, яшчэ ў савецкім дзяцінстве нам расказвалі пра стравы для касманаўтаў у цюбіках? Сёння кожны жадаючы можа набыць сабе такі цюбік або цэлы набор — яны прадаюцца, як правіла, у інтэрнэт-крамах, адзначыла Алена Маргунова. Гэта натуральны, здаровы прадукт (хоць пра шкоду адсутнасці жавання — глядзі вышэй), цалкам бяспечны, кажа суразмоўніца. Супа́м (боршч, грыбны, гарохавы і г. д.), другім стравам (каша з мясам, бекон, катлеты, адбіўныя і нават піца), дэсертам (тварог з ягадамі, сокі, фруктовыя пюрэ і нават пірожныя) надаецца пюрэпадобная кансістэнцыя, пасля чаго іх пакуюць у цюбікі па 165 грамаў. Першыя цюбікі былі алюмініевыя, цяпер — са шматслойнага ламінату, таксама выкарыстоўваюцца пакеты з адмысловага поліэтылену і пластыку. Сапраўды, «касмічнае харчаванне» вельмі збалансаванае па мікра- і макранутрыентам, прызнае спецыяліст. У камплекце, як правіла, ідзе прыстасаванне для разагрэву пюрэ да 60 градусаў. Праўда, гэтыя цюбікі — досыць дарагое задавальненне. Часцей іх купляюць як сувеніры ці ў падарунак, а калі сродкі дазваляюць, то і ў якасці дапаўнення да ўласнага рацыёну.

— Усе вышэйапісаныя «вынаходкі» — не больш чым мода. Тое ж касмічнае харчаванне (вернемся да яго) — наўрад ці спосаб пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў або аздаравіць арганізм, — падкрэслівае спецыяліст. — Яно сапраўды можа быць карыснае і на Зямлі — у экстрэмальных умовах, калі ты здзяйсняеш узыходжанне на гару ці сплаўляешся на байдарцы ўдалечыні ад цывілізацыі. Але седзячы на дачы — навошта замяняць, напрыклад, ягады пюрэпадобнай сумессю, калі вось яны, на кусце.

І НАРЭШЦЕ...

Спартыўнае харчаванне наўрад ці можна назваць чымсьці новым (як і малекулярную кухню). Яно атрымала папулярнасць яшчэ на заранку моды на здаровы спосаб жыцця, і сёння ўжо стала часткай нашай паўсядзённасці. Гэта натуральныя дабаўкі, якія вырабляюць са звычайных прадуктаў харчавання, і прызначаны яны апрыёры для людзей з актыўным спосабам жыцця. Штодзённасцю спартыўнае харчаванне стала, а вось разуменне, каму і навошта яго ўводзіць, у многіх так і не з'явілася, кажуць дыетолагі. Пагадзіцеся, у першае або другое наведванне фітнес-клуба не-не ды і закрадаецца думка: ці не паспрабаваць спартыўнае харчаванне? Да таго ж калі на першым паверсе шматпавярховага будынка размешчана спартзала з фітнес-барам, а наверсе — офісы, нярэдка іх работнікі туды спускаюцца, каб купіць да гарбаты «карысны» пратэінавы батончык. Між тым, у выпадку няправільнага прымянення такога харчавання можна нанесці сур'ёзную шкоду здароўю.

— Індустрыя фітнесу сёння вялікая, напрамкаў у спартыўным харчаванні існуюць дзясяткі, а прадуктаў — сотні. Разабрацца ў гэтым моры пачаткоўцу складана. Як правіла, большасць прадуктаў для спартыўнага харчавання — высокабялковыя. Павышанае паступленне бялку необходнае арганізму, што пераносіць рэгулярныя фізічныя нагрузкі. Што ж адбываецца, калі ты не атрымліваеш гэтых нагрузак, але атрымліваеш павышанае паступленне бялку? Празмерная колькасць яго, «памножаная» на павольны метабалізм офіснага работніка, можа стаць прычынай шэрага захворванняў касцёва-мышачнай сістэмы, павышаецца рызыка з'яўлення камянёў у нырках.

І нават калі вы рэгулярна наведваеце спартзалу, для гэтых прадуктаў існуе выразнае дазіраванне. Дзённая колькасць прадукту вар'іруецца ў залежнасці ад інтэнсіўнасці нагрузкі. Я раіла б звярацца з табліцай — як правіла, яна паказаная на ўпакоўцы.

А ў цэлым, адзначае спецыяліст, замест пошукаў прынцыпова новых прадуктаў харчавання і страў лепш разабрацца з традыцыйным рацыёнам. Дадаць у яго больш зялёнай агародніны і свежай сезоннай садавіны, а ў сваё жыццё — фізічную актыўнасць на вольным паветры, каб разагнаць метабалізм і абудзіць здаровы апетыт.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Прывіды беларускіх муроў

Крокі княжацкіх забойцаў

«Каб ты на Крэўскі замак каменне цягаў»

Менавіта так клялі нашыя продкі ворагаў — можаце ўявіць, як цяжка далося ўзвядзенне таго замка, калі і праз стагоддзі памяць засталася?

Зрэшты, нічога дзіўнага — гэта было першае такое каменнае збудаванне на беларускіх землях, узведзенае ці не ў канцы XIII стагоддзя. Месца складанае: балота, зліццё рачулак Крэўка і Шляхцянка. Насыпалі пясок, стваральчы выспу, пад фундаменты падкладвалі дубовыя і яловыя сукі... Нават сёння паглядзець на магутныя валуны, умураваныя ў сцены замка, — здзівішся... І паверыш легендзе, якую цытуе Анатоль Бутэвіч у кнізе пра Крэўскі замак «Раскіданае гняздо крывіцкай славы», пра волатаў, што будавалі гэтыя муры, перакідваючы ажно з Меднікаў сюды і назад гіганцкі молат — у Меднікаў якраз таксама ўзводзілі замак.

Паўзруйнаваныя змрочныя сцены, што ўсё яшчэ захоўваюць сваю веліч... Прыцемак, ціша... Мястэчка непадалёк засынае, адспяваўшы пеўнямі, адгрукатаўшы коламі на брукаванцы... Раптам — чуеце? — нейкі лязгат... Нібыта метал грукае аб метал... Рухаецца нехта, закаваны ў латы... Здушаны крык...

СМЕРЦЬ КЕЙСТУТА

Яшчэ б такое месца не насялялі прывіды! Крэўскі замак мае з дзясятак містычных гісторый. Самая вядомая — пра падзеі XIV стагоддзя... Гэта калі кароль Ягайла падступна заманіў да сябе дзядзьку Кейстута і ягонага сына Вітаўта — нібыта на перагаворы, бо схапіліся князі не на жарт за ўладу. Кейстут і Вітаўт заміж бяседнага стала апынуліся ў сутарэннях Крэўскага замка. Сын Гедыміна Кейстут быў выдатным палкаводцам, не раз перамагаў войскі рыцараў-ордэнцаў, але вызначаўся прастадушным характарам...

Забіваць яго прыйшлі на пяты дзень. Кажуць, некалькі вояў Ягайлы і адзін рыцар-храмоўнік, з якімі Ягайла заключыў пагадненне. Задушылі Кейстута залатым шнурком ад яго ж убрання. Было гэта ў самай вялікай і злавеснай вежы, якая завецца Княжацкай. Як піша Анатоль Бутэвіч, «Прывід жа гэтай непатрэбнай ахвяры часта з'яўляўся на сценах і вежах, у палацавых пакоях, палохаючы насельнікаў і нагадваючы ахвотнікам да несправядлівых і злосных дзеянняў пра абавязковую адплату за злачынства».

А яшчэ нібыта здані забойцаў Кейстута не атрымалі спакою і дасюль з'яўляюцца па начах. Паказвацца не паказваюцца, а вось крокі іхнія чуваць. Гэты сюжэт выкарыстаў пісьменнік XIX ст. Ігнат Ходзька ў сваім апавяданні «Духабаронца». Душы злачынцаў змушаныя кожную ноч прыходзіць у замак, каб зноў забіць старога князя. Шукаюць яго, не знаходзяць — вось і цягаюцца...

ПАКАРАННЕ ПРЫСЛУГІ

Чуваць нібыта тут па начах і яшчэ адзін прывідны гук: перадсмяротны жаночы крык. Гэта працяг той жа гісторыі... Вітаўту, які пасля гвалтоўнай смерці бацькі зразумеў, што на літасць стрыечнага брата спадзявацца не даводзіцца, удалося ўцячы — з дапамогай прыслугі. Нібыта яе прывяла з сабой жонка Вітаўта, Ганна Смаленская, якой дазволілі спатканне з мужам. Вітаўт пераадзеўся ў адзежу прыслугі і сышоў. Дзяўчына, якая ахвяравала сабою, загінула: яе, паводле адной з легендаў, скінулі з замкавых муроў, а яны вышынёй да 13 метраў... Вось яе крык і чуваць...

Вакол гэтага сюжэта таксама ўзнікла шмат твораў, прыдумляюць матывы ўчынку дзяўчыны. Самы папулярны — каханне. Аўтары мастацкіх трактовак не сумняваюцца, што вызваліцелька князя была маладой і прыгожай. Праўда, па логіцы, яна мусіла быць даволі высокай і мажнай, як праслаўлены воін?

Вядомы гісторык Алег Дзярновіч так апісвае вынікі раскопак у Княжацкай вежы, якія дазваляюць больш падрабязна ўявіць месца злачынстваў:

«Сярод важных высноў можна адзначыць наступную — адсутнасць у вежы падвалаў (сутарэнняў). Фактычна, цокальны паверх, у якім адсутнічалі вялікія стральчатыя вокны, як на другім ці трэцім ярусе, у пэўным сэнсе і выконваў функцыю сутарэнняў вежы. Звязана гэта было, відавочна, з забалочанасцю мясціны, у якой узводзіўся замак. Пры гэтым самі падмуркі вежы дасягаюць глыбіні трох метраў ад узроўню сучаснай дзённай паверхні.

Вельмі важным здаецца выяўленне ў паўднёва-ўсходняй сцяне вежы арачнага праходa да ўнутранага тунэля вежы. Перамяшчэнне паміж ярусамі ўнутры вежы адбывалася не праз праёмы ў скляпеннях, а праз тунэль-праход, які серпанцінам агібаў увесь перыметр вежы. Выхад на ярусы адбываўся праз арачныя праёмы... Аналагі падобных унутрывежавых тунэляў вядомыя. Найбольш блізкі аналаг, да таго ж у аднатыпным замку (кастэль з вежай-данжонам) існуе ў замку ў Меднікаx (Мядзінінкай).

Распрацоўка апісаных шурфоў дазволіла дайсці да самага нізу ўнутранай прасторы Княжацкай вежы — туды, дзе, як мяркуецца, знаходзілася замкавая вязніца і дзе, як высвятляецца, захоўваўся таксама замкавы арсенал».

Пасля смерці Кейстута менавіта ў гэтых мурах з'явіўся «Акт Крэўскай уніі 1385 года», які, праўда, некаторыя даследчыкі лічаць містыфікацыяй. У тым акце Ягайла ўзамен на шлюб з польскай каралевай Ядвігай «абяцае землі свае літоўскія і рускія на вечныя часы да Кароны каралеўства Польскага далучыць».

Князь Вітаўт жадаў незалежнасці свайму княству і памёр, не дачакаўшыся каранавання — карону, бласлаўленую ў Рыме, перахапілі па дарозе палякі.

КАВАРНАЯ КРАСУНЯ

А вось наконт наступнай легенды... Нібыта з'яўляецца ў Крэўскім замку яшчэ адна здань: прыгожая дзяўчына з сабачкам. Біліся з-за красуні двое прэтэндэнтаў, адзін перамог, саперніка забіўшы... А яна і таму гарбуза дала. Вось і загадаў мясцовы князь замураваць яе разам з яе ўлюбёным сабачкам у сцяну замка. Здань шкодная: тых, хто спрабуе да яе дакрануцца ці пагладзіць сабачку, губіць. Не вельмі зразумела, адкуль бяруцца такія смелыя, што пнуцца абшчапераць празрысты цень ці пацісаць прывіднага сабачку... Але аднойчы эфірная паненка нават спакусіла аднаго небараку дапамагчы ёй вызваліцца ад праклёну: для гэтага належала ўчыніць страшэнны грэх. Напрыклад, вынесці ўсё золата з Крэўскага касцёла. Хлопец усё сабраў, не заўважыў толькі, што запэцканая ў сажы палачка, якой гасілі свечкі, таксама была залатой... Таму выйсці з касцёла з нарабаваным не змог, а дзяўчына засталася праклятаю. Ды яшчэ і з выгляду пастарэла, мегера мегерай.

У легенды мала факталагічных прывязак. Затое яна падазрона падобная на легенду, звязаную з Дзявочай гарой, што каля вёскі Дуброва — гэта не так далёка ад Крэва. Прыгажуня ўчыніла спаборніцтва паміж двума закаханымі ў яе хлопцамі. Стала на вяршыні гары, а спаборнікі мусілі каціць на гару па вялікім камені. Хто пераможа — таму й дзеўка...

Ускараскаліся, напінаючыся... І абодва ад напругі памерлі. Вось іх там, на вяршыні гары, і пахавалі. І прыгажуню з імі — зажыва.

Ужо ў наш час на Дзявочай гары рабілі раскопкі, знайшлі рэшткі язычніцкага капішча, прысвечанага жаночаму бажаству, пахаванні жрыц, магілу мужчыны з прыкметамі гвалтоўнай смерці. Цалкам магчыма, было гэта нейкай аналогіяй культу Артэміды, і мужчынам нельга было туды заяўляцца.

Паколькі і Крэўскі замак будаваўся, калі яшчэ квітнела язычніцтва, нават назву мястэчка выводзяць ад імя язычніцкага жраца Крыві-Крывейта, магчыма, легенда пра прынесеную ў ахвяру дзяўчыну — водгулле паганскіх абрадаў.

ШАЛЁНЫ ЭМІГРАНТ

І яшчэ адна гісторыя, якая патэнцыяльна магла б «спарадзіць» містыку...

Нейкі час Крэўскі замак належаў даволі дзіўнаму гістарычнаму персанажу — князю Андрэю Курбскаму. Прыбліжаны маскоўскага цара Івана Грознага, Курбскі перабег да польскага караля. Шлейфам яго ўчынку служыць доўгая перапіска з Іванам Жахлівым, поўная велягурыстых узаемных дакораў ды абраз, узор літаратуры XVI стагоддзя.

Дык вось, кароль Жыгімонт Аўгуст пастараўся ўзнагародзіць важнага перабежчыка. Сярод падараванага яму была пасада Крэўскага старасты. Так што, магчыма, менавіта тут, у гэтых замкавых сценах, Курбскі і сачыняў свае лісты да Грознага.

Не сказаць, што са старастам Крэву пашэнціла — кароль то дапамагаў яму разабрацца з падаткамі, то разбіраў звады Курбскага з суседняй шляхтай. Неяк абавязаў вярнуць суседцы 200 авечак, скрадзеных у яе ўладаннях.

Ну і каб умацаваць становішча Курбскага сярод мясцовай фанабэрыстай арыстакратыі, падабралі яму жонку — удовую княгіню Марыю Гальшанскую, стрыечную сястру канцлера вялікага літоўскага Астафія Валовіча.

Праз нейкі час Марыя пачала слаць лісты, што муж-масковец збівае яе і трымае ў зняволенні. І вось прыязджаюць афіцыйныя асобы гэта расследаваць: Андрэй Курбскі ў ложку, побач сядзіць жонка, ціхая, бледная, збольшага маўчыць, адрывіста пацвярджаючы запэўніванні мужа, што ўсё добра.

Яшчэ больш падазрэнняў выклікала, калі Марыя напісала запавет, у якім перадавала сваю маёмасць мужу, абыходзячы правы двух сваіх дарослых сыноў ад першага шлюбу.

Курбскі прыехаў адтуль, дзе жанчын трымалі ў церамах, ён, як вынікае з перапіскі, шчыра лічыў іх «сасудамі граху». Але не на тую нарваўся. Сыны Марыі пачалі рабіць узброеныя наезды на ўладанні айчыма, радня пацягнула маскоўца ў суд. Падчас доўгіх судовых пасяджэнняў Курбскі лаяўся так, што яго словы не ўносілі ў судовыя кнігі, маўляў, пры патрэбе сам іх паўторыць для жадаючых. Нарэшце кароль выклікаў свайго пратэжэ ў Варшаву і змусіў даць жонцы развод. «А на Курбского от короля опала не бывала, а была на него от короля и от панов от больших кручина за то, была за ним жена, княгиня Дубровицкая, сестра двоюродная пана Остафия Воловича, а в приданных за нею был город Дубровицы с поветом. И Курбский княгини не любил и не жил с нею. И били на него челом королю Остафий Волович да братья жены его, что с женою не живет, держит ее у себя в неволе, а именем приданым владеет великим. И король за ним посылал, а велел ему быть у себя в Варшаве и с княгинею, да велел ему со княгинею развестись, имение у него приданое велел отнять, и что он Остафию учинился недруг, да и король из-за того его не любит», — давалі справаздачу Івану Грознаму маскоўскія паслы.

Быў яшчэ непрыгожы эпізод... Марыя вінаваціла Курбскага-«акрутніка» ў тым, што выкраў яе прыслугу Раіну (дзяўчына мусіла для сваёй пані ўкрасці ў Курбскага дакументы на маёнткі). Курбскі трымае Раіну ў зняволенні, мучыць, загадвае сваім слугам яе гвалціць. Курбскі, у сваю чаргу, вінаваціў жонку ў чарадзействе, нібыта знайшоў у яе рэчах мяшэчак з пяском, валоссем ды іншым падазроным начыннем.

Карацей, звад хапае на цэлы раман. Асноўныя падзеі, праўда, адбываліся не ў Крэве, а ў Ковелі і Дубровенскім маёнтку. Але ясна, што Андрэй Курбскі, якога Іван Грозны ў лістах упікаў, што згвалціў жонку нейкага стральца, быў здатны на лютыя ўчынкі. І прыпісаць з'яўленне жаночай здані яго злачынству зусім верагодна.

Сёння замак аднаўляецца, прымае гасцей... Ці будзеце вы ўслухоўвацца ў падазроныя гукі, углядацца ў цені — ваша справа. Але роля, якую Крэўскі замак адыграў у гісторыі нашай краіны, зусім не прывідная.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Радзімазнаўства

«ЗНАЁМЦЕСЯ — СВАЦЦЯ!»

Праз дзесяцігоддзі, нават сотні гадоў, аўтэнтычны строй набывае асаблівае значэнне, а тэхналогіі яго стварэння становяцца ледзь не сакральнымі ведамі. Прадмет асаблівага гонару Кобрынскага раёна — убранне свацці з вёсак Лелікава і Павіцце. Традыцыі вырабу і выкарыстання гэтага народнага касцюма ў 2018 годзе былі ўключаны ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А. В. Суворава, нягледзячы на ваенна-гістарычны профіль, у сваёй рабоце імкнецца прыцягнуць увагу да нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў рамках гісторыка-краязнаўчага праекта «Знаёмцеся — свацця!», займаецца збіраннем экспанатаў па этнаграфіі.

Рэалізацыя любога маштабнага праекта патрабуе шмат часу і намаганняў. Дадзеная задумка не стала выключэннем. Але пра ўсё па парадку.

Паколькі ў галіне народнага адзення і тэкстылю хутка ідзе працэс разбурэння ў сувязі з сыходам з жыцця старэйшага пакалення — носьбітаў традыцый, было вырашана: пакуль не позна, сабраць поўны камплект строю свацці з Лелікава і Павіцця Кобрынскага раёна. Аказалася, што здабыць касцюм вельмі няпроста. Мясцовыя жыхары, якія захоўваюць у куфрах асобныя часткі касцюма, не спяшаюцца з імі расставацца, нават на час.

У творчага калектыву Кобрынскага музея выспела рашэнне вярнуць касцюм свацці ў сучаснае жыццё, надаць яму «другое дыханне» — пашыць рэпліку адзення. Такі варыянт «адраджэння» магчымы, таму што традыцыі вырабу касцюма былі аднесены да гісторыка-культурных каштоўнасцяў катэгорыі «Б». Такія каштоўнасці могуць быць адноўленыя на другасным матэрыяле і існаваць у сучаснай форме.

Касцюм свацці — своеасаблівая візітоўка ўсяго Кобрынскага раёна. З аднаго — гэта тыповы народны строй, які складаецца з кашулі, спадніцы, фартуха. З другога — касцюм адрозніваецца павышанай дэкаратыўнасцю. Усе часткі пашытыя з бавоўняных тканін і багата аздобленыя аплікацыяй. На палічках, рукавах, манішцы кашулі, на фартуху нашытыя «вочы» — ланцужкі з закругленых ромбаў, у сярэдзіне якіх вышыты васьмівугольныя зоркі. Касцюм свацці шылі «з вачыма», таму што яна кіравала вяселлем і ўсё мусіла бачыць. Гэтыя зоркі-вочы таксама засцерагалі маладых ад сурокаў.

Адметнай асаблівасцю строю з'яўляецца незвычайны галаўны ўбор у выглядзе какошніка, упрыгожанага рознакаляровымі пукамі пеўневых пёраў, што падкрэслівае баявы дух свацці, сваячкі жаніха.

У пачатку XX стагоддзя ў такім адзенні на вяселлі была старэйшая свацця і свашкі — маладыя жанчыны ды нават дзяўчынкі-падлеткі з роду жаніха. Старэйшая свацця сачыла за паслядоўнасцю вясельных абрадаў, удзельнічала ў галоўных момантах урачыстасці.

Супрацоўнікі музея заняліся вывучэннем асаблівасцяў касцюма свацці, працавалі з літаратурай, замалёўкамі даследчыкаў-этнографаў, старымі фотаздымкамі, музейнымі калекцыямі, распыталі людзей сталага веку, знаёміліся з вопытам старэйшых майстрых. Вельмі дапамаглі ў рабоце матэрыялы, якія сабралі загадчык аўтаклуба ДУК «Кобрынская раённая клубная сістэма» Вольга П'янцава і іншыя работнікі культуры райвыканкама.

У працэсе вывучэння аўтэнтычнага ўбрання з'явіліся пытанні, адказы на якія ведала галоўная захавальніца старажытнай традыцыі, жыхарка вёскі Лелікава Настасся Шапяцюк. Да яе і адправіліся супрацоўнікі музея.

Настасся Ігнацеўна, якая ў свой час пашыла касцюмы для сваіх унучак Дашы і Каці, падзялілася сакрэтамі вырабу ўбрання свацці. Спадніца магла быць любога колеру, але досыць часта шылі яе з чырвонай тканіны. Свацця насіла толькі адну «затулку» (фартух). Такое пытанне паўстала таму, што на Кобрыншчыне жанчыны часта насілі па два фартухі адразу, пры гэтым падол верхняга падтыкаўся так, каб было відаць узор на ніжнім.

Не існуе колеравай заканамернасці пры размяшчэнні стужак на спадніцы, кожная швачка размяшчае іх на свой густ. Фрагменты аплікацыі ў выглядзе «вачэй-ланцужкоў» спачатку «нажыўляюцца» ўручную, а потым усё адзенне шыецца на машынцы.

Ёсць свае сакрэты і ў захоўванні касцюма: спадніца і фартух складваюцца па шырокіх падоўжаных складках, апрацоўваюцца прасам, а потым звязваюцца ў некалькіх месцах.

Для «ажыўлення» малюнка трэба было знайсці майстра, якога называюць універсальным: і таленавітую швачку, і добрую закройшчыцу. Акуратная, працавітая — гэта тыя якасці, якія характарызуюць Іну Корсак, што пагадзілася ўзяцца за адказную справу. Калі былі гатовыя асобныя фрагменты касцюма, належала завяршыць «вочы» — вышыць у сярэдзіне зоркі. Гэта работа была выканана вопытнай вышывальшчыцай Галінай Аўдзеевай.

